КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 32 (1210) 8 жніўня 2015 г.

ШЛЯХЕТНЫ ЮБІЛЕЙ

Заўтра Палескі драматычны тэатр адкрывае юбілейны 10-ы сезон, паводле традыцыі, "Пінскай шляхтай" В.Дуніна-Марцінкевіча, але ў новай пастаноўцы Віталя Баркоўскага, прэм'ера якой адбылася ў канцы студзеня. Нягледзячы на новае рэжысёрскае рашэнне, у спектаклі захавалася яго былая адметнасць — выкарыстанне палескага дыялекту.

Фота прадастаўлены тэатрам

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Тэндэнцыі

Што абмяркоўваць будзем? І дзеля чаго?

Напярэдадні Форуму бібліятэкараў Беларусі

Чарговы, чацвёрты па ліку, Форум бібліятэкараў Беларусі пройдзе з 15 па 17 верасня ў Маладзечанскім раёне. Назва-дэвіз мерапрыемства за апошнія гады не змянілася: "Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцей і беларускай дзяржаўнасці". Пагадзіцеся, такое сталае пазіцыянаванне абавязвае нашы бібліятэкі да многага.

Яўген РАГІН

Да падзеі — паўтара месяца. Арганізацыйны камітэт Форума ўжо створаны. Узначальвае яго дырэктар НББ Раман Матульскі. Ягоны першы намеснік Алена Далгаполава стала і намесніцай старшыні згаданага камітэта. Дадамо, што да ўсяго з'яўляецца яна і кіраўніком Савета грамадскага аб'яднання "Беларуская бібліятэчная асацыяцыя". Гэта, як вядома, — асноўнае карпаратыўнае фарміраванне нашых кніжнікаў. Яму б яшчэ і ўплывовасці. Але не будзем пра нязбыўнасць мары літаральна ўсіх нашых прафесійна-творчых грамадскіх суполак. Пагаворым лепей пра моманты арганізацыйнага характару.

Па словах Алены Далгаполавай, удзельнічаць у Форуме павінны айчынныя прафесіяналы ўсіх узроўняў: ад абласнога да раённага ды сельскага. Але на апошні дзень ліпеня (менавіта тады адбылася наша гаворка), канстатавала Алена Ерамееўна, ніводнай сельскай заяўкі на ўдзел у мерапрыемстве не паступала. Паўтара месяца на тое, каб вызначыцца з праблемным полем, на якім і павінны "зарунець" парасткі будучых форумных дэбатаў, на тое, каб удакладніць, узгадніць ды ўдасканаліць свае прапановы па паляпшэнні сітуацыі — гэта многа ці мала? Адказ на такое пытанне, як падаецца, можна ўсвядоміць толькі пад час Форума. Каб да яго рашэнняў прыслухаліся, трэба, каб мерапрыемства займела ў грамадстве не абы-які розгалас.

Дык што будзем абмяркоўваць на Форуме? Па словах кіраўніка ББА, — ход скарачэння бібліятэчнай сеткі, аб'яднанне публічных і школьных устаноў на сяле, укараненне інфармацыйных тэхналогій. У абласцях і раёнах з апошнім асаблівых пытанняў няма, а вось на вёсцы… Таму без сельскіх спецыялістаў падзея, я перакананы, не набудзе належнага гучання.

З гэтым пагаджаецца дырэктар Магілёўскай абласной бібліятэкі Ілона Сарокіна. Абяцае, прынамсі, што вясковыя бібліятэкары Магілёўшчыны на Форуме будуць прадстаўлены абавязкова. І гэта пры тым, што названая вобласць практычна не мае праблем у бібліятэчнай справе. Уважлівы чытач ведае, што і камп'ютараў тут хапае, і да кадраў стаўленне вельмі прынцыповае. Вось толькі сапраўдны чытач становіцца апошнім часам не надта распаўсюджанай з'явай. Таму, прызнаецца спадарыня Сарокіна, падначаленым установам даводзіцца займацца не вельмі ўласцівымі для профіля справамі. На ўвазе маюцца рознажанравыя агітацыйныя акцыі, якія на пэўных беларускіх абсягах толькі апрабоўваюцца, а вось у замежжы даўно сталі завядзёнкай. Урэшце, не будзем забывацца на "кантэкст беларускай дзяржаўнасці" ў бібліятэчнай дзейнасці. Не будзе чытачоў, не будзе і профіля. Так што ў дадзенай справе пераможа не кансерватар, а крэатыўшчык.

> ...Удзельнічаць у Форуме павінны айчынныя прафесіяналы ўсіх узроўняў: ад абласнога да раённага ды сельскага. Але на апошні дзень ліпеня **ніводнай сельскай заяўкі на ўдзел у мерапрыемстве не паступала**.

А вось намеснік дырэктара Кармянскай ЦБС Наталля Савасцеева перакананa, што на форуме неабходна ўзнімаць кадравую праблему. Палова бібліятэкараў ў раёне — перадпенсійнага ўзросту. І не было б перашкод для амаладжэння галіны, калі б у выніку аптымізацыі спецыялісты не працавалі пад пагрозай скарачэння, не мелі клопату з жыллём, не думалі пра тое, дзе б яшчэ падзарабіць…

Заканчэнне артыкула **чытайце на старонцы 2.**

Выбары-2015

Кампанія па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі ўжо практычна дасягнула апагею. Многія суайчыннікі паспелі пакінуць свой аўтограф у падпісных лістах, а камусьці яшчэ трэба будзе пазнаёміцца з членамі ініцыятыўных груп патэнцыйных кандыдатаў. Практычна ва ўсіх людных месцах сталіцы і ў рэгіёнах працуюць пікеты, вечарам зборшчыкаў подпісаў нярэдка можна сустрэць і на парозе сваёй кватэры.

Фота Аліны САЎЧАНКА

Нагадаем, што Цэнтральная камісія Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў дапусціла да ўдзелу ў зборы подпісаў 8 ініцыятыўных груп: Аляксандра Лукашэнкі, Сяргея Калякіна, Сяргея Гайдукевіча, Віктара Цярэшчанкі, Мікалая Улаховіча, Жанны Раманоўскай, Таццяны Караткевіч і Анатоля Лябедзькі. Для таго каб кандыдат быў зарэгістраваны, трэба сабраць не менш за 100 тысяч подпісаў. Пры гэтым канкрэтны грамадзянін Беларусі мае права ставіць подпіс за вылучэнне адразу некалькіх кандыдатаў, але ён не можа падпісвацца два і больш разы за аднаго прэтэндэнта.

Збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў на пасаду кіраўніка дзяржавы будзе доўжыцца да 21 жніўня ўключна.

Паводле інфармацыі БелТА

ф о т а ф а к т

Яшчэ раз пра тапаніміку



У гістарычным цэнтры Барысава на адным з будынкаў з'явілася мапа старога горада з гістарычнымі тапонімамі. З мапы можна даведацца, дзе знаходзіліся такія часткі горада, як Казіны Рог, Лужок, Барок… А вакол будынка з чырвонай цэглы, які рэстаўруецца і дзе змешчана вышэйзгаданая мапа, пакладзена брукаванка.

Алена ЛЯШКЕВІЧ / Фота аўтара

Газета КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАПІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Настасся МІГНО.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 448. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 06.08.2015 у 16.30. Замова 3167. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Мне не аднойчы даводзілася пісаць пра дызайн і дызайнераў, але кожны раз, прыступаючы да гэтай тэмы, я наноў вырашаю для сябе пытанне: "Што такое дызайн?" Яно зусім няпростае. Гэтае пытанне я часта задаю людзям, якія маюць непасрэднае дачыненне да дызайну. Яшчэ ніколі я не чуў двух аднолькавых адказаў. Разбежка ў меркаваннях — велізарная: ад схематычна-простых "Дызайн — від мастацтва" да разгорнутых, кшталту — "від праектнай дзейнасці, што мае мэтай фарміраванне такога матэрыяльнага асяроддзя чалавека, якое дазволіць яму максімальна раскрыць свае станоўчыя, з пункту гледжання грамадскай маральнасці, якасці"; ад сітуацыйна-канкрэтнага "Вызначэнне функцыянальных якасцей прамысловых вырабаў" да метафізічнага "Дызайн — гэта любоў". Апошняе вызначэнне асабіста мне найбольш блізкае, прытым што яно з прычыны сваёй эмацыянальнасці нічога не тлумачыць і ўвогуле цягне ад канкрэтыкі замоўленай тэмы ў няўцямную сферу пачуццяў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Дзе прытуліцца

Проста справа ў тым, што менавіта энергія эмоцый, укладзеная ў рэчы, што выходзяць з-пад рук дызайнера, надае функцыянальным прыладам адухоўленасць, робіць іх "цёплымі". Калі хочаце, ачалавечвае іх. У гэтым сэнсе няма розніцы паміж майстрамі Старажытнага Егіпту, Рэнесансу, эпохі Прамысловай рэвалюцыі і нашымі днямі. Скажу так: каб зрабіць самалёт, трэба найперш палюбіць неба; трэба палюбіць дом, перш чым зрабіць для яго мэблю, а сукенка атрымаецца прыгожай, калі робіш яе для каханай жанчыны. І увогуле, каб работа стала творчасцю, трэба любіць прафесію — гэта аксіёма.

Сёлета я прысутнічаў на абароне дыпломаў па амаль ўсіх спецыяльнасцях факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Што не бачыў на свае вочы, потым знайшоў у Сеціве. Такім чынам, пэўнае ўяўленне пра творчы патэнцыял маладых спецыялістаў згаданай галіны і новае папаўненне культурнай сферы я маю. Акадэмія дбае пра свой імідж, таму дыпломных работ, якія б не дацягвалі да высокіх стандартаў, выпрацаваных у гэтай ВНУ, я не бачыў. Праўда, некаторыя падаліся мне адпавядаючымі хутчэй узроўню курсавых работ, чым дыплома, але гэта суб'ектыўнае меркаванне. Даваць ацэнку асобным дыпломам — не мая справа. Гэта кампетэнцыя Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Я ж толькі дазволю сабе выказаць меркаванне адносна некаторых тэндэнцый, што выявіліся на абароне.

Першае, што мушу адзначыць, — гэта глыбокае ўваходжанне дыпломнікаў у замоўленую тэму, грунтоўны перадпраектны аналіз сусветнай практыкі ў дадзенай галіне. Я меў магчымасць у гэтым пераканацца, бо як рэцэнзент азнаёміўся з некаторымі тлумачальнымі запіскамі да дыпломных работ. Сёння важным раздзелам тлумачальнай запіскі і дыпломнай работы ўвогуле з'яўляецца не толькі абгрунтаванне сацыяльнай значнасці, эстэтычнай каштоўнасці і канструктыўнай мэтазгоднасці праекта, але і тэхніка-эканамічны расклад: якія матэрыялы, з якімі функцыянальнымі якасцямі, у якой колькасці, якія грошы патрэбныя для рэалізацыі ідэі. Пагартаўшы такую запіску, і на праект іншымі вачыма глядзіш. За сумленнае стаўленне да працы ў такіх выпадках даруеш пэўную недавядзёнку на фінальнай стадыі. Канстатую: метадычна праца над дыпломамі на факультэце пастаўлена грунтоўна і робіцца якасна.

У гэтым сэнсе я зайздрошчу сённяшнім студэнтам. Нас у 1970-я гады вучылі інакш. Дызайн быў тады для краіны справай новаю. Ніякай зыходнай методыкі не было. Сістэму прафесійнай адукацыі ставілі, што называецца, "з колаў", і яна непазбежна праходзіла стадыю спробаў і памылак. І студэнты, і выкладчыкі ў роўнай ступені аказаліся закладнікамі сітуацыі і ўдзельнікамі эксперыменту "на выжыванне". Да нашых рэалій спрабавалі прыстасаваць сістэмы Вхутэмасу і "Баўхаўза". І тая, і другая разглядалі дызайнера (мастака-канструктара) як гэткага ўніверсальнага "байца-спецназаўца", які мусіць быць майстрам на ўсе рукі, усё ведаць і ўсё ўмець. Маўляў, ці мала што ў жыцці спатрэбіцца! У выніку я, дызайнер-графік, вывучаў інжынерную псіхалогію, тэарэтычную механіку, сапрамат, тэхналогію матэрыялаў, а на трэцім курсе ледзь не вылецеў з Тэатральна-мастацкага інстытута (!) за не здадзены ў час залік па тэхналогіі пластмас. Далася мне тады ў знакі "палімерызацыя артафталевых ангідрыдаў"… А насамрэч патрэбныя ў практыцы дызайнера-графіка асновы друкарскай справы і фотаграфіку мы пачалі вывучаць толькі бліжэй да дыплома. Ва ўмовах недастаткова распрацаванай методыкі значна большую ролю, чым зараз, адыгрывалі выкладчыкі са сваім жыццёвым і прафесійным досведам. Для мяне, памятаю, вызначальным былі не палажэнні навучальнай праграмы, а менавіта меркаванні настаўнікаў. Бо гэта былі людзі, якія ўжо мелі сякі-такі практычны досвед у той галіне, куды мы, студэнты, толькі рыхтаваліся трапіць.

Сёння ж прыйшлі да таго, што дызайнера зыходна, ад першага курса, трэба вучыць як спецыяліста канкрэтнай галіны. Аб'ёмны дызайн, графічны, камунікатыўны, дызайн прадметна-прасторавага і віртуальнага асяроддзя... Такая сканцэнтраванасць дае плён, што добра відаць на прыкладзе дыпломных работ.

Асаблівасцю гэтай абароны было тое, што ў юбілейны для БДАМ год шэраг дыпломных работ як на мастацкім, так і на факультэце дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва рабіліся як падарункі alma mater да 70-годдзя. Сярод іх быў і анімацыйны ролік, які прэзентуе будынак БДАМ як помнік архітэктуры, і арт-аб'ект для ўнутранага дворыка Акадэміі, і праекты інтэр'ераў, і карціны, якія яго

Што абмяркоўваць будзем? І дзеля чаго?

Напярэдадні Форуму бібліятэкараў Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

У чым, як падаецца, магчымая канструктыўнасць будучага Форума бібліятэкараў Беларусі? У спрадвечным і надзвычай эфектыўным -прынцыпе "Выратуй сябе сам". Міжабласны, міжраённы абмен вопытам павінен хоць неяк скрануць справу з месца. Хтосьці мае трывалыя напрацоўкі ў пытанні жыллёвага забеспячэння маладых спецыялістаў. Хтосьці знайшоў найбольш кароткі і шчыры шлях да чытацкіх сэрцаў. А дзесьці метадам спроб і памылак навучыліся працаваць са спонсарамі…

Дык чаму гэты вопыт не ўзяць на ўзбраенне, пераканаць сваё кіраўніцтва, што вось ён, найбольш аптымальны варыянт развіцця гуманітарна-асветніцкай бібліятэчнай справы? Тым больш, што вераснёўскі форум адбудзецца напярэдадні Міжнароднай канферэнцыі, якую запланавана правесці ў Навуковай бібліятэцы БНТУ, і міжнароднага бібліятэчнага кангрэса, што мае адбыцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Форум павінен стаць не тое што рэпетыцыяй, а па вялікім рахунку — доказам таго, што і мы ў дадзеным кірунку развіцця пачуваем сябе не пачаткоўцамі: ведаем, куды рухацца і што для гэтага рабіць. Ці я памыляюся?

Папярэднія Форумы ладзіліся на Лагойшчыне. Сёлетні вырашана правесці ў Маладзечанскім раёне. Я спачатку быў падумаў, што такі выбар — невыпадковы. Летась у Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча ў Маладзечне абваліўся дах. Да рамонту прыступілі толькі сёлетняй вясной. Ён не завершаны, як аказалася, і па сёння. Вось побач з такой установай і правесці б адно з пасяджэнняў. Не думаю, каб тыя, ад каго залежыць выпраўленне сітуацыі, гаварылі доўга і пераканаўча… Адмоўны досвед — таксама справа карысная. Усе ўдзельнікі Форума надоўга запомнілі б, як не трэба рабіць… Аднак не, месца правядзення Форума звязана не з магчымасцю нагляднага вывучэння безгаспадарчасці. Прычыны больш трывіяльныя і звязаныя з эканоміяй сродкаў на правядзенне форумных мерапрыемстваў. І дах бібліятэкі тут — не прычына. Ну і шкада, што так.

К

ўніверсал?

ўпрыгожылі. У гэтых праектах дыпломнікі імкнуліся спалучыць прадстаўнічасць і дэмакратызм. Мяркую, што ў большасці выпадкаў гэта атрымалася.

Праекты дызайнераў-аб'ёмшчыкаў я характарызаваў бы як аптымістычныя. Гэта перспектыўныя распрацоўкі для прадпрыемстваў беларускага машынабудавання, якія, паводле пэўных меркаванняў, перажываюць сёння складаны час. Што датычыць побытавых прылад, таксама прадстаўленых дызайнерамі-аб'ёмшчыкамі, дык яны таксама вартыя таго, каб на іх паклалі вока беларускія вытворцы.

Усе праекты дызайнераў-экспазіцыянераў з'арыентаваны на магчымую рэалізацыю. Гэта, у прыватнасці, гуллёвая дзіцячая пляцоўка ў сталічным парку Дружбы народаў, новая экспазіцыя Музея I з'езда РСДРП, дэманстрацыйны стэнд прамысловага аб'яднання "Атлант"… У кожным з пералічаных, таксама як і ў незгаданых праектах гэтага сегменту дызайна, ёсць рацыянальнае зерне. Ад дыпломнай работы, уласна кажучы, большага і не патрабуецца. Ды ўсё ж заўважу, што тая практыка, калі дызайнеры з году ў год звяртаюцца да існуючых, раскручаных брэндаў у якасці дыпломнай тэмы, не падаецца мне плённай. Абавязкова кожны год хтосьці зоймецца Цэнтральным батанічным садам, згаданым вышэй "Атлантам", Беларускай чыгункай альбо Мінскім аўтазаводам, хаця сталічныя ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы і так някепска "упакаваныя" і ні ў новых брэндах, ні ў рэбрэндынгу пільнай патрэбы не маюць. Да таго ж, у кожнай такой структуры ёсць свой сталы штат дызайнераў, і яны не ўзрадуюцца, калі нехта звонку пажадае пасвіцца на іх абшары, адбіваць іхні хлеб. Так што нават вельмі ўдалая прапанова дыпломніка БДАМ у межах Мінскай кальцавой дарогі хутчэй за ўсё застанецца незаўважанай. Яе свядома праігнаруюць. А вось у рэгіёнах, як я пераконваўся у час камандзіровак, бракуе якаснага дызайна. Раённыя дамы культуры, краязнаўчыя музеі, музычныя фестывалі, прадпрыемствы, якім далёка да заводаў-гігантаў, але за кошт якіх існуюць малыя гарады з навакольнымі вёскамі, усе яны з задавальненнем прымуць дапамогу ад факультэта дызайна і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДАМ. У рэгіёнах шанцы на рэалізацыю праектаў, пра якія я згадваў вышэй, даволі высокія.

Дызайн віртуальнага асяроддзя і тэлерэклама — гэта прафесія, народжаная тэлеэкранам і Сецівам. На сёння гэтая прастора ўяўляе з сябе даволі пярэсты ландшафт, дзе нялёгка знайсці патрэбную інфармацыю. Дыпломныя работы дызайнераў згаданых прафесій, якія я бачыў сёлета на абароне, могуць дадаць названаму ландшафту новых фарбаў, але не ўпэўнены, што паспрыяюць ягонай уладкаванасці, зручнасці для гледача, адбяруць рэйтынг у расійскіх каналаў з той прычыны, што вельмі размытае аблічча ўвогуле маюць нашы тэлебачанне і беларуская дзялянка Сеціва. Некалькі яркіх штрыхоў праблему падвышэння іміджу тут не вырашаць. Для выпраўлення сітуацыі патрэбны больш грунтоўныя захады.

Дызайнеры інтэр'ераў і мэблі спрабуюць адпавядаць амаль рэвалюцыйным зменам у нашым побыце і, галоўнае, у псіхалогіі грамады. Адкрыўшы для сябе навакольны свет, новыя пакаленні сувярэннай краіны жадаюць жыць камфортна і прыгожа, рэалізуючы няздзейсненую мару пакалення сваіх бацькоў. Эстэтыка, закладзеная ў шэрагу дыпломных праектаў па аздобе інтэр'ераў, грунтуецца, як мне падаецца, на згаданай гэданістычна-канфармісцкай платформе. Гэта правільна, бо запыт нараджае прапановы. Мусяць быць ухваленымі спробы вынаходніцтва асобнага беларускага стылю інтэр'еру і мэблі, якія я бачыў на абароне. Але беларускасць, як мне падаецца, гэта нешта большае, чым інкрустацыя саломкай, перанесеная з малых прадметаў на вялікія плоскасці.

Такім жа чынам я мог бы характарызаваць і дыпломы мадэльераў адзення. Тут імкненне адпавядаць сусветным эстэтычным стандартам спалучаецца са спантанным пошукам нацыянальнай ідэнтычнасці. Але дамінуе ўсё ж такі міжнародны стыль.

Кераміка і шкло… Калі коратка — прыгожа. Відаць, што творчая моладзь, не ігнаруючы напрацаванага папярэднікамі досведу, шукае свой адметны почырк. Пошук ёсць, пра знаходкі гаварыць цяжэй… Але напрамак акрэслены перспектыўны.

На заканчэнне — пра графічны дызайн. Гэта адна з самых папулярных у абітурыентаў і запатрабаваных у грамадстве спецыяльнасцей. Высокі конкурс пры паступленні з'яўляецца бар'ерам, пераадолець які можна толькі пры наяўнасці пэўных ведаў і навыкаў, а таксама высокай ступені матывацыі да навучання. Можа таму для гэтай кафедры звычайная з'ява, калі курсавая работа па ўзроўні цягне на дыплом. Прынамсі, у канцэптуальным сэнсе. У дыпломах часта прысутнічаюць вечныя тэмы — эканалагічная і антываенная. Былі яны і зараз. Як станоўчую з'яву назаву зварот дыпломнікаў да нацыянальнай тэматыкі, імкненне адлюстроўваць беларускі змест, пазбягаючы штампаў і стэрэатыпаў. На гэтай абароне мне запомніліся ілюстраваныя беларускія прымаўкі, якія мусяць змяшчаць на кашульках, і буклеты пра Мінск ды Навагрудак, прызначаныя для турыстаў, але дасціпная форма падачы інфармацыі робіць іх цікавымі і для саміх жыхароў гэтых гарадоў.

Неяк адзін з выкладчыкаў кафедры графічнага дызайну распавядаў мне, што выхаванцы БДАМ, трапляючы за мяжу, здзіўляюць тамтэйшых працадаўцаў высокім узроўнем сваёй прафесійнай падрыхтоўкі. На прагматычным Захадзе, дзе студэнта вучаць толькі таму, што яму неабходна ведаць і ўмець, нашы выхаванцы са сваімі "залішнімі" ведамі і навыкамі выглядаюць універсаламі, мастакамі-"спецназаўцамі", пра якіх я згадваў напачатку нататкаў. Можа лінія на выхаванне творцы-універсала, зыходна закладзеная ў сістэму нашай дызайн-адукацыі, была ўсё ж такі правільнай? Хай бы толькі гэтая ўніверсальнасць ішла на карысць менавіта нашай краіне (прыблізна палова маіх аднакурснікаў, дыпломнікаў 1979 года працуюць не ў Беларусі). У наступных выпусках працэнт "пілігрымаў" толькі павялічваўся…

К

Фотасюжэт нумара

Гліняны "Арт…"

Завяршыўся XIII Міжнародны пленэр па кераміцы "Арт-Жыжаль", які ладзіўся з 9 па 31 ліпеня на базе адпачынку "Вербкі" пад Бабруйскам. Своеасаблівая інтэрнацыянальная майстэрня, дзе гліна дзякуючы абпалу ператвараецца ў самыя сапраўдныя творы мастацтва, сабрала на гэты раз майстроў-глінамесаў ажно з 10 краін свету, у тым ліку — і з Японіі. А 30 ліпеня ў Бабруйскім мастацкім музеі імя Георгія Паплаўскага адкрылася вынікавая выстаўка ўдзельнікаў свята керамікі. Творы з гліны бабруйчане і госці горада змогуць убачыць у музейных залах цягам амаль усяго жніўня.

Фота Алены ЧЭПЕЛЕВАЙ

Соцыум

У пошуках "эліксіра маладосці"

2015-ы, аб'яўлены Годам моладзі, паставіў у асаблівае становішча тыя тэатры, у самой назве якіх фігуруе моладзь. Што ж у тых тэатрах "маладзёжнага"? І як клапоцяцца пра маладзёжную аўдыторыю ў іншых тэатрах — да прыкладу, у Новым драматычным?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Маладосць… бальзакаўскага ўзросту?

У Маладзёжным тэатры эстрады трупа сапраўды маладзёжная. А вось рэпертуар, мякка кажучы, своеасаблівы — пераважна, шоу, разлічаныя на самых непатрабавальных гледачоў. Колькасць дэцыбел такая, быццам на танцполе дзесьці ў полі. Моладзь у зале ўбачыць можна. Але гэта не тыя "прасунутыя" юнакі ды дзяўчаты, якія цікавяцца ўсім новым у мастацтве. І хаця тыя ж прэтэнзіі да грубага, неінтэлігентнага гумару можна прад'явіць практычна ўсім спектаклям тэатра, у афішы і дагэтуль вылучаецца "Мікітаў лапаць — "руками не лапать", бо тут ёсць хаця б нацыяльная аснова — п'еса Міхася Чарота (якая, праўда, для большай "сучаснасці" і гумару, ідзе на трасянцы). І вельмі добрая пластыка, якая не дае магчымасці адчуць сябе ў машыне часу з адзінай функцыяй — назад.

Але ж як змяняецца кантынгент публікі на некаторых "гасцявых" спектаклях! Дастаткова ўзгадаць хаця б тэатральна-асветніцкі праект Паўла Харланчука "Біблія Радзівіла", які выклікаў такі аншлаг, што давялося трансляваць пастаноўку онлайн у Інтэрнэце. Можа, падобныя "госці" паўплываюць і на асноўную афішу Тэатра эстрады?

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр успрымаецца "музейным", ледзь заходзіш у залу, аздобленую спалучэннем мармуру, золата і барвовага аксаміту — усё з прыстаўкай "псеўда" для эканоміі сродкаў. Ну проста Вялікі тэатр у версіі эканомкласа! Вядома, усё гэта планавалася яшчэ да таго, як узнікла ідэя перадаць адрамантаваны будынак тэатру, сама назва якога патрабуе адпаведнага інтэр'ера. Ды ўсё ж і на цяперашнім этапе, запрасіўшы таленавітага дызайнера і паставіўшы перад ім умову нічога не разбураць (эклектыка — адна з модных тэндэнцый), можна было б дапоўніць атмасферу хаця б намёкам калі не на "экстрым", дык хаця б на сучаснае пераасэнсаванне мінулага замест урачыстага "настальжы".

Заканчэнне артыкула **чытайце на старонцы 4.**

Дзяжурны па нумары

У каторы раз хочацца выказацца пра стварэнне і выкарыстанне культурных брэндаў. Ці не кожны айчынны горад ды нават старадаўняе мястэчка маюць сваю "фішку". Вось толькі адны з года ў год яе "раскручваюць", у той час як другія або саромяцца нечага, або робяць мерапрыемства не для публікі, а для славутай "галачкі".

Кастусь АНТАНОВІЧ

Мала мець проста брэнд...

Напрыканцы ліпеня ў Віцебску прэзентавалі праект "Вясельная феерыя "Закаханыя над горадам". Як можна здагадацца з назвы, праект прысвечаны Марку Шагалу, а калі быць дакладней, 100-гадоваму юбілею шлюба мастака і ягонай музы Бэлы Розенфельд. Але якая б назва ні была, ці не кожны арт-праект у горадзе так ці іначай звязаны з ягоным пазнавальным брэндам. Вось і цяпер рэалізацыя праекта была падтрымана Віцебскім гарвыканкамам, як адзначалася арганізатарамі, "у мэтах турыстычнай і інвестыцыйнай прывабнасці горада". І такая стаўка апраўдала сябе, бо нават фінансаванне мерапрыемства па правядзенні культурнага праекта ажыццяўлялася выключна за кошт спонсарскіх паступленняў і дабрачыннай дапамогі. А яшчэ зусім не лішнімі былі сродкі, зароблены ўстановамі культуры горада пад час самога мерапрыемства, якія такім чынам папоўнілі іх пазабюджэт.

Калі глядзець аб'ектыўна, то нічога звышнатуральнага ў межах праекта не адбылося. Тым не менш добра раскручанае свята з тэатралізаванай дэманстрацыяй абраду яўрэйскага шлюбу хупа прайшло пры вялікім натоўпе гасцей і журналістаў. Формула поспеху вымалёўваецца бездакорная: адметны брэнд плюс крэатыўнасць, памножаныя на працавітасць работнікаў культуры, дадалі ў суме прэстыжу для горада і вобласці ды вызначыліся немалым грашовым прыбыткам.

Немалаважны момант, які трэба ўлічваць арганізатарам падчас раскруткі сваіх брэндаў, — праца са спонсарамі. Завяршыліся святкаванні 100-годдзя вяселля Шагала ў Тэатры імя Якуба Коласа, дзе адбылася цырымонія ўзнагароджання партнёраў і спонсараў культурнага праекта. Так-так, менавіта ўшанаваннем тых людзей, дзякуючы фінансаванню якіх свята адбылося. Часам на гэта ў раёнах забываюцца, а пасля здзіўляюцца, чаму гэта спонсары да іх ідуць з неахвотай. Калі ўвогуле ідуць.

Яшчэ адзін цікавы арт-праект, які з гонарам паказваю сваім замежным гасцям, дзейнічае ў цэнтры Мінска і прысвечаны выдатнаму мастаку Міколу Селешчуку. Рэпрадукцыі ягоных карцін выстаўлены пад адкрытым небам на плошчы Якуба Коласа. Але чаму б не зрабіць нешта падобнае, крэатыўнае на малой радзіме мастака, у Маларыце? З тэатралізаванай дзеяй, жывым музычным суправаджэннем. Думаецца, праект пад умоўнай назвай "Музычнае ўспрыняцце жывапісу" зацікавіў бы многіх. А той жа Язэп Драздовіч! Глыбокае і Шаркаўшчына не могуць падзяліць ягоную спадчыну, але разам з тым не здольныя пакуль інтэрактыўна, з размахам прадставіць творчасць мастака, ажывіўшы, прыкладам, ягоную касмічную тэматыку на гарадскіх вуліцах.

Зразумела, што не толькі начальнікі аддзелаў і упраўленняў павінны ініцыяваць і распрацоўваць мерапрыемствы, падобныя да віцебскага. Без метадычнай і рэжысёрскай падтрымкі тут ніяк не абысціся. І калі метадысты ў раёнах маюцца, то з рэжысёрамі — сапраўдная праблема. Мо варта заснаваць з гэтай нагоды хаця б універсітэцкі конкурс на сцэнарый і правядзенне лепшага мерапрыемства культуры? Бо сустракаюцца і такія прыклады. Некалькі гадоў таму давялося папрысутнічаць на святкаванні 100-годдзя першай сустрэчы двух нашых класікаў — Якуба Коласа і Янкі Купалы — на хутары Смольня. Святкаванне ўяўляла з сябе экскурсію для групы музейшчыкаў з Расіі па мясцінах, звязаную з жыццём і творчасцю Канстанціна Міцкевіча, выступленне некалькіх мясцовых музычных калектываў і адмысловую дэгустацыю старадаўніх вясковых прысмакаў. А чаму б не зрабіць з гэтага юбілею масавае, інтэрактыўнае раённае свята? Пытанне, на жаль, пакуль без адказу. Ну а ўзровень шэрагу літаратурных святаў у нашай краіне, якія праводзяцца з года ў год як пад капірку па пэўным шаблоне. Тым не менш, грошы з бюджэту на такія імпрэзы выдаткоўваюцца. Вось толькі розгаласу пра іх не пачуеш, не сустрэнеш на іх і арміі турыстаў.

Застаецца спадзявацца, што на чарговым Дні беларускага пісьменства, што сёлета пройдзе ў Шчучыне, менавіта цікавая праграма, а не павільёны з шашлыкамі, будуць прыцягваць увагу аматараў айчыннай літаратуры і не толькі яе.

К

У пошуках "эліксіра маладосці"

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

У рэпертуары тэатра пачалі з'яўляцца першыя маладзёжныя парасткі — пакуль больш у зваротах да класікі ("Беспасажніца", "Чэхаў. Камедыя. Чайка") і з запрашэннем расійскіх рэжысёраў... Дадамо, што падзел на спектаклі маладзёжныя і не — дастаткова ўмоўны, пра што не стамляюцца згадваць, да прыкладу, арганізатары Міжнароднага маладзёжнага форуму "М@rtКантакт" у Магілёве. Ды ўсё ж, пагадзіцеся, маладзёжнасць больш асацыюецца з эксперыментам, маладым задорам, творчым "хуліганствам" — чымсьці новым, крэатыўным, а не замшэлым.

Не стала суперздабыткам "Сіняя птушка", прэм'ерай якой адкрыўся адноўлены будынак ТЮГа. Можа, гэта было звязана менавіта з пераездам і зразумелым жаданнем паказаць усе тэхнічныя магчымасці "наварочанай" сцэны? Але відовішчнасць, "карнавальнасць" (усё роўна ніякі тэатр не перасягне тут кіно і камп'ютар) засланілі ў спектаклі думку. Дакладней, звялі ўсё філасофска-сімвалічнае багацце, усю прытчавасць п'есы да банальнага выслоўя: "шчасце — побач". Яно і сапраўды побач, але каб убачыць, што "хатняя" птушка сіняя, а не звыкла шэрая, героям трэба было прайсці ўвесь той шлях выпрабаванняў. І зразумець, што шукаць "птушку шчасця" трэба заўжды, бо як толькі супакойваешся, што яе злавіў, яна знікае. А можа, новае ўвасабленне п'есы М.Метэрлінка (як тут не ўзгадаць ранейшы "маленькі шэдэўр" — у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек!) скіравана менавіта да новага пакалення, якое развучылася думаць?..

Затое менавіта гэтаму — думаць, аналізаваць, асэнсоўваць чалавечыя ўчынкі і саму гісторыю — вучаць у Гомельскім гарадскім маладзёжным тэатры. Асаблівы плён у выхаванні падлеткаў прынесла пастаноўка "СвиДЕТИли" паводле С.Алексіевіч, прысвечаная Вялікай Айчыннай.

Пра маладзёжную аўдыторыю пачалі задумвацца (праўда, з рознай інтэнсіўнасцю і з самымі супярэчлівымі вынікамі) і ў іншых тэатрах. Ды ўсё ж адным з самых "маладзёжных па духу" застаецца Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, каталізатарам "амалажэння" ў якім выступае Цэнтр беларускай драматургіі і рэжысуры. А флагманам маладзёжнасці, калі пад ёй разумець не толькі эксперыментальнасць, а яшчэ і высокі эстэтычны ўзровень міжнароднага маштабу, — лепшыя спектаклі адразу некалькіх лялечных тэатраў краіны. Нельга не згадаць і "ТэАРТ" — не толькі як Міжнародны форум, але і найперш як арт-карпарацыю, якая цягам не адно фестывальных дзён, а ўсяго года ладзіць разнастайныя эксперыментальныя праекты.

Тэатр + навучэнцы

Адным з самых маладзёжных з'яўляецца спектакль "Як я стаў..." у Новым драматычным тэатры, скіраваны на балючыя (асабліва ў юнацтве) тэмы кахання і здрады і цалкам вырашаны (што па драматургічным матэрыяле, што па яго ўвасабленні) на сучаснай мове, блізкай і зразумелай моладзі. Пастаноўка ўжо стала "хітом", асабліва сярод старшакласнікаў. І справа не толькі ў ёй. У гэтым тэатры, як і ва ўсіх іншых, хапае пастановак "розных і... слабых" (лічы, састарэлых). Але галоўны адміністратар тэатра Аляксандр Хает даўно, прычым з зайздросным пастаянствам, дбае пра абнаўленне глядацкіх пакаленняў. Пры творчым калектыве існуе клуб "Сябры Новага тэатра". Стаўка робіцца найперш на старшакласнікаў, студэнцкую аўдыторыю. У гэтым ёсць рацыя, бо праз некалькі гадоў, стварыўшы ўласныя сем'і, тая моладзь прыйдзе ў тэатр са сваімі дзецьмі.

Каб прыцягнуць адпаведную аўдыторыю, тэатр шчыльна супрацоўнічае з навучальнымі ўстановамі. Але прапануе ім не звыклыя "культпаходы", а, да прыкладу, конкурс на лепшае эсе, якое будзе залічана ў вучэбным працэсе, паўплываўшы на выніковую адзнаку, а таксама зможа прынесці аўтару бонус ад самога тэатра — запрашальнік. Так, у мінулым сезоне пачалося доўгатэрміновае супрацоўніцтва тэатра з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя М.Танка. Разлік вельмі просты: у сілу спецыфікі сваёй будучай прафесіі, цяперашнія студэнты-тэатралы праз некалькі гадоў прывядуць у тэатр цэлыя класы. І не дзеля "птушачкі", а з папярэдняй падрыхтоўкай маленькіх гледачоў да таго ці іншага спектакля.

Цягам некалькіх месяцаў выкладчыкі ўніверсітэта мэтанакіравана праглядалі ўсе спектаклі рэпертуару і спынілі свой выбар на "Каралеве прыгажосці" М.МакДонаха, палічыўшы гэту пастаноўку своеасаблівым "метадычным дапаможнікам" па псіхалогіі. Пасля таго "закрытага" прагляду, квіткі на які былі выкуплены ўніверсітэтам, адбылася сустрэча з артыстамі, кожны з якіх падзяліўся з гледачамі сваім успрыманнем герояў і ўзаемаадносін паміж імі. Нарэшце, з'явіліся эсе, і педагогі вызначылі лепшыя работы: Вікторыі Кетрыс, Настассі Парманчук, Настассі Рубан, Кацярыны Котавай.

Ужо сёння ў тэатра ёсць новы праект — не проста на наступны сезон, а на ўвесь 2016 год: пяць дзіцячых (дакладней, сямейных) спектакляў з вызначанымі датамі іх правядзення і "лекцыйнымі" тэмамі, якія будуць суправаджаць кожны прагляд. Усё гэта названа тэатральна-асветніцкай цыклавой праграмай "Чароўны свет тэатра", абанементы на якую пачнуць распаўсюджваць з верасня.

Ды ўсё ж давядзецца крыху разбавіць гэтыя пераможныя ноткі дробкай скептыцызму. Сама ідэя — папросту шыкоўная. Кульгае хіба яе ўвасабленне. Цалкам зразумела, чаму педуніверсітэт абраў менавіта "Каралеву прыгажосці": у аснове п'есы — канфлікт маці і дачкі, дзе кожны адначасова і абвінавачаны і пацярпелы. Але ж як данесена гэта складаная тэма ў спектаклі?

Калісьці Новы драматычны быў першым у Беларусі тэатрам, які адкрыў нашай публіцы не толькі ўласна гэту п'есу, але і саму постаць яе знакамітага аўтара. Вось толькі, у адпаведнасці з нашай ментальнасцю, у пастаноўцы крыху перароблены фінал: дачка не забівае маці качаргой, тая памірае сваёй смерцю. За гады, што мінулі з прэм'еры, спектакль не мог не змяніцца, а тым больш, у адсутнасці рэжысёра, які яго ставіў. Гледзячы пастаноўку разам з аўтарамі будучых эсе, я лавіла сябе на думцы, што на іх месцы наўрад ці справілася б з заданнем. Бо артысты, пры ўсёй іх адданасці, у кожнай наступнай сцэне іграліі пэўную эмоцыю, не асабліва задумваючыся, чаму іх герой дзейнічае менавіта так, а не іначай. Пры адсутнасці ўнутранай логікі паводзін абсалютна ўсе персанажы ўспрымаліся рэальнымі ці патэнцыйнымі пацыентамі псіхіатрычнай клінікі. Мэг нагадвала казачную Бабу Ягу з псіхалогіяй пяцігадовага свавольніка, яе саракагадовая дачка Морын — неўраўнаважанага падлетка. Яшчэ большым вар'ятам, а зусім не закаханым, успрымаўся Пата. Хіба яго дваццацігадовы брат Рэй цягам усяго спектакля заставаўся свядомым сімвалам новага цынічнага пакалення.

А што ж убачылі ва ўсім гэтым студэнты? Адна з дзяўчын пабудавала "праекцыю" адлюстраванай у п'есе сітуацыі на сваё асабістае жыццё і прыйшла да высновы, што ва ўсім вінавата "хітрая бабуля". У адным з водгукаў быў такі публіцыстычны канчатак: "Калі мы звяртаем увагу на нашы адрозненні адно ад аднаго — мы аддаляемся, становімся адзінокімі. Калі на першы план мы выносім наша падабенства — мы становімся адным цэлым. У адзінстве наша сіла. У адзінстве — наша мужнасць быць". Усё быццам правільна і педагагічна, але што тады рабіць з "не такімі, як усе" — іншымі словамі, з чалавечай індывідуальнасцю? Яшчэ ў адным з эсе (і, дарэчы, у пытаннях з залы ў час абмеркавання) Морын упарта называлася Лорын, хаця на спектаклі і праграмкі раздаваліся бясплатна, і п'есу знайсці ў інтэрнэце не праблема. Цікава, што ніхто з аўтараў не адзначыў супярэчлівасці мужчынскіх вобразаў, усе гаварылі хіба пра каханне да магілы. Але ж ці было яно насамрэч?

Цудоўна, калі спектакль вымусіў задумацца. Але з пункту гледжання псіхалогіі (а менавіта з гэтай дысцыплінай было звязана наведванне тэатра) можна было чакаць больш глыбокага аналізу, а не проста канстатацыі "вайны" між маці і дачкой. Магчыма, у будучым з'явяцца і іншыя формы вывучэння псіхалогіі на прыкладзе тэатральных вобразаў. У прыватнасці, карысным было б параўнанне п'есы са спектаклем (для пачатку — не такіх складаных, як згаданыя вышэй). Яшчэ больш цікавым — параўнанне некалькіх пастановак паводле аднаго літаратурнага матэрыялу, тым больш што сталічныя тэатры даюць такую магчымасць.

Відавочна адно: падобнае супрацоўніцтва тэатра з навучальнымі ўстановамі, наяўнасць у тэатры чагосьці накшталт "клуба аматараў" (і, натуральна, заўсёднікаў) надзвычай перспектыўныя. Было б жаданне! Як з боку тэатраў, так і з боку саміх навучальных устаноў, якія маглі б самі звяртацца ў тэатры са сваімі ініцыятывамі. Бо калі мы сёння не выхаваем дасведчанага, удумлівага тэатральнага "спажыўца", дык заўтра ўсім творчым калектывам, дбаючы пра касу, давядзецца ставіць толькі сумнеўныя шоу. Ці, калі ў іх будуць з'яўляцца папраўдзе высокагустоўныя сучасныя пастаноўкі, шукаць "пакупнікоў" выключна ў заходнім замежжы. Гэтыя працэсы, між іншым, ужо пачаліся...

К

■ Падзел на спектаклі маладзёжныя і не — дастаткова ўмоўны. Ды ўсё ж маладзёжнасць больш **асацыюецца з эксперыментам, маладым задорам, творчым "хуліганствам"** — чымсьці новым, крэатыўным, а не замшэлым.

■ ...Супрацоўніцтва тэатра з навучальнымі ўстановамі, наяўнасць у тэатры чагосьці накшталт "клуба аматараў" (і, натуральна, заўсёднікаў) **надзвычай перспектыўныя**. Было б жаданне! Як з боку тэатраў, так і з боку саміх навучальных устаноў.

Кінадворык у Гістарычным

меркаванне

Ліна МЯДЗВЕДЗЕВА,
каардынатар фестывалю
"Cinema Perpetuum mobile"

Айчынныя кінарэжысёры вельмі трапятліва ставяцца да сваёй працы, але часта не ведаюць, што рабіць з выніковым прадуктам.

Канешне, пачынаючым творцам хочацца, каб стужка дайшла да гледача, але ейным пракатным лёсам яны практычна не цікавяцца, не імкнуцца ўспрымаць карціну з пункта гледжання прадзюсара ці пракатчыка. Часта даводзіцца, так бы мовіць, бегаць за аўтарам, "выпрошваць" работу. Але патрачаны час варты таго: у выніку шырокая аўдыторыя чуе новыя імёны айчыннага экраннага мастацтва, а самі пачаткоўцы ўжывую бачаць сваю патэнцыйную аўдыторыю.

На першы план мы ставім асветніцкую мэту. "БелКінаЛета" — адзін з праектаў некамерцыйнага міжнароднага фестывалю "Cinema Perpetuum mobile". За чатыры гады мы прайшлі да таго, што можам прадставіць на вялікіх экранах карціны айчынных рэжысёраў. Сёння мы маем мікс: побач з непрафесійнымі рэжысёрамі ў нашых праграмах задзейнічаны работы прафесійных пачаткоўцаў. Сярод аўтараў сустракаюцца тыя, хто скончыў БДАМ, хто яшчэ не давучыўся, але працягвае здымаць кіно. Ёсць і кінамастакі, якія, наадварот, адчулі, што ім не хапае ведаў і пайшлі у вучэльню, каб з аматараў стаць прафесіяналамі.

Сёлета ў "Cinema Perpetuum mobile" была асобная конкурсная беларуская праграма. Некаторыя айчынныя стужкі ўвайшлі ў міжнародныя праграмы дакументальнага ("Валацужка Юрык" Дар'і Андрыянавай), іграваога ("Вартаўнік" Віктара Красоўскага) і эксперыментальнага кіно. Шкада было, што гледачоў прыйшло не так багата, як чакалася. Каб пашырыць кола прыхільнікаў маладога айчыннага кіно, мы вырашылі ўлетку правесці рэтраспектыву беларускіх праграм.

Нацыянальны гістарычны музей, з адміністрацыяй якога мы неаднойчы супрацоўнічалі, прапанаваў цікавы фармат: праводзіць кінапаказы… на свежым паветры — ва ўнутраным дворыку музея! Мы дадалі ў канцэпцыю грамадскія абмеркаванні з рэжысёрамі найбольш дыскусійных работ. Нам хацелася менавіта інтэрактыву, каб людзі не толькі глядзелі карціны, але маглі пагутарыць з непасрэднымі ўдзельнікамі кінапрацэсу.

У дворыку Гістарычнага музея склалася цудоўная нефармальная атмасфера. Частка публікі месціцца на крэслах, астатнія прыходзяць са сваімі турыстычнымі дыванкамі, коўдрамі і размяшчаюцца на вялізнай сцэне. Фармат кінематаграфічнага опен-эйра дазваляе прыходзіць і сыходзіць у любы момант, выйсці за кавай і вярнуцца да прагляду. Такі варыянт кінавідовішчаў зараз надзвычай папулярны ў Еўропе. Цякучка пастаянная, але зала паўнюткая ды колькасць наведвальнікаў за адзін сеанс большая, чым на стандартным паказе, куды нельга спазняцца. Зрэшты, у кінадворык акрамя звычайнай публікі прыходзіць шмат кіношнікаў. Творчыя людзі часта існуюць паасобку, не ведаюць адзін аднаго. Мы ў нейкім сэнсе аб'ядноўваем кінематаграфічную моладзь, фарміруем сваеасаблівае прафесійнае асяроддзе.

Да кінасустрэч на свежым паветры мы падрыхтавалі караткаметражкі, што былі сёлета і летась у конкурснай і пазаконкурснай праграмах праекта "Cinema Perpetuum mobile". А таксама тры рэтраспектывы беларускіх рэжысёраў: "іграваіка", выпускніка Варшаўскай кінашколы Сяргея Каласоўскага, дакументаліста Ігара Чышчэні і кінааматара Нікіты Лаўрэцкага. Апошні, дарэчы, у гэтым годзе перамог у конкурснай фестывальнай праграме са стужкай "Дзень народзінаў у Мінску".

Праект фінішуе ў першы тыдзень восені. Да яго заканчэння, у Дзень ведаў, мы правядзем "Вікіфікацыю". Падобная акцыя адбудзецца ў другі раз, першая праходзіла ў рамках "Cinema Perpetuum mobile". Справа ў тым, у што сусветным Сеціве амаль няма звестак пра айчыннае экраннае мастацтва. Так, існуе шыкоўны даведнік "Усе фільмы" і чатырохтомнік па гісторыі беларускага кіно, але хацелася б мець, напрыклад, і іх алічбаваныя версіі… Мы пачалі з простага: запрасілі спецыялістаў і праграмістаў, каб тыя навучылі ўсіх жадаючых ствараць старонкі пра беларускаю кінатворчасць у сусветна вядомай сеткавай энцыклапедыі.

Добра ці дрэнна, але тэндэнцыя цяпер такая: для моладзі асноўнай крыніцай інфармацыі становіцца Інтэрнэт, таму неабходна, каб абавязкова з'яўляліся е-старонкі пра айчынныя фільмы, знакавыя творчыя кінапостаці і іх маладых прадаўжальнікаў. Вельмі хочацца, каб імёны нашых кінематаграфістаў былі на слыху ў розных пакаленняў суайчыннікаў. Спадзяюся, нашы акцыі стануць добрымі прыступкамі да гэтага.

Занатавала
Настасся ПАНКРАТАВА

Вышыванка… ад Антона

меркаванне

Антон ТАЛАШКА,
маларытчанін

Нядаўна я атрымаў дыплом інжынера-энергетыка скончыўшы энергетычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Паўла Сухога. На першае месца працы размеркаваны ў Гомель, а каб не сядзець без справы, у вольны час вышываю крыжыкам на швейнай машынцы.

Майму захапленню толькі 5 месяцаў. А мая мама, Алена Аляксандраўна, выдатна шые на машынцы, але жадання самому сесці і нешта пашыць не ўзнікала. Лічыў, што гэта зусім не мужчынскі занятак. Бавячы час у інтэрнэт-прасторы, выпадкова трапіў на сайт, які быў прысвечаны вышыўцы на машынцы. Там мужчыны з веданнем справы распавядалі пра сваё захапленне і паказвалі гатовыя работы. Мне захацелася зрабіць прыемны і нечаканы падарунак для сваёй мамы. Вось і ўзяўся за ажыццяўленне задуманага.

Унікнуць у сутнасць справы было не так і цяжка, быццам бы адразу ўсё стала атрымлівацца. Пра захапленне даведалася і мама: стала падказваць, дапамагаць, раіць.

Цяпер я сябе магу, напэўна, лічыць спецыялістам. На 60 футболках ужо вышыты ўзоры. Але яны не паўтараюцца, не аднолькавыя, а зусім розныя. Таму кожная вышытая футболка — штучны тавар, эксклюзіўны. Спачатку былі простыя ўзоры, затым — больш складаныя. Цяпер жа я пераключыўся на маларыцкі строй адзення, што захапляе сваёй самабытнасцю, непаўторнасцю: мы звыкла ацэньваем тканыя і вышытыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, асаблівасці арнаменту, гармоніі каларыту. Але народная вышыўка і ткацтва — яшчэ і бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор — то сімвал! Цікава ж даведацца, пра што распавядаюць яны. У гэтым мне дапамагае спецыяльная літаратура. Хлопец ці дзяўчына ў вышытай у народным стылі футболцы выглядае вельмі эфектна, стыльна… Адным словам, прыгожа. Акрамя таго, я заўважыў, што ў сучаснай моладзі ёсць пэўная патрэба ў нацыянальнай сімволіцы, цяга да роднага. Адзенне ў народным стылі становіцца модным, запатрабаваным.

Калі вельмі сціпла апісаць, то спачатку выбіраю ўзор, затым арнамент (малюнак) пераношу ў камп'ютар. Сам жа працэс вышывання адной футболкі ў мяне займае недзе тры гадзіны… Неабходныя кансультацыі мне дае дырэктар Маларыцкага раённага цэнтра народнай творчасці Валянціна Струнец.

Ужо падрыхтавана (у камп'ютарным варыянце) 26 мужчынскіх і 14 жаночых арнаментаў, а таксама яшчэ 50 адвольных узораў. Усё гэта можна ў любы момант запусціць у вытворчасць. Цяпер пераводжу у камп'ютар узоры маларыцкага строю адзення. Між іншым, пяць мужчынскіх на сённяшні дзень ужо гатовы.

> Але народная вышыўка і ткацтва — яшчэ і **бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак**. Што ні ўзор — то сімвал! Цікава ж даведацца, пра што распавядаюць яны. У гэтым мне дапамагае спецыяльная літаратура. Хлопец ці дзяўчына ў вышытай у народным стылі футболцы выглядае вельмі эфектна, стыльна…

Занатаваў
Мікалай НАВУМЧЫК

Ініцыятывы: кулінарныя ды…

меркаванне

Валерыя КЛІЦУНОВА,
старшыня беларускага грамадскага
аб'яднання "Адпачынак у вёсцы"

Сярод мэт нашай арганізацыі — спрыянне развіццю сельскага і экалагічнага турызму, яго папулярызацыя. Распрацоўваючы турыстычныя маршруты, мы імкнемся ўлічыць праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Праўда, не заўсёды атрымліваецца паказаць рэгіянальныя адметнасці турыстам.

Бывалі кліенты, якія казалі: "Можна без выпрабавання фальклорам?" Шмат рэчаў інтымных, сакральных, не ўсё пакажаш. Мы цэлую этычную праграму распрацавалі з гэтай нагоды.

Засмучае, што святары забараняюць вернікам — носьбітам нематэрыяльнай спадчыны — праводзіць абрады. Дапамагае ўнясенне элементаў у інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Людзі, якія гэтым займаюцца, хадзілі ў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, каб святарам растлумачылі, што не варта забараняць спрадвечнае. Абрады — яскравыя ўзоры этнакультуры, якая ўзнікла значна раней за любую рэлігію. Дзе сканчваецца этнакультура і пачынаецца паганства — гэта вельмі этычна складаны ўнутраны момант.

Наша арганізацыя падтрымлівае шматлікія мясцовыя ініцыятывы. Імкнемся прывозіць групы на "Жаніцьбу Цярэшкі" ў Лепельскі раён, на "Мотальскія прысмакі" ў Іванаўскі. Рабілі некалькі праектаў з Дрыбінскімі шапаваламі. Распрацавалі брэнд "Краіна шапавалаў". Адна сям'я носьбітаў традыцый шапавальства, якая стварыла аграсядзібу, наведвала нашы семінары. Каб у Дрыбінскі раён паехалі турысты на некалькі дзён, павінна быць праграма атракцый. Гаспадарам трэба вучыцца паказваць, як стрыгуць авечак, робяць сыр. Варта распрацаваць майстар-класы. Валёнкі, зразумела, адразу не навучышся рабіць, але брошачку, цацку, калі дзеці… Гэта ўсё пытанне прэзентацыі.

Цікава назіраць, як мяняюцца студэнты падчас такіх паездак. Падавалася б, яны, прадстаўнікі факультэта міжнародных адносін, не надта іх упадабаюць. Але, прыехалі ранкам у Лепельскі раён на "Жаніцьбу Цярэшкі" ды вывучылі песні, танцы. Калі ўдзень далучылася асноўная маса гасцей, ужо вучылі іх, дапамагалі арганізатарам.

Беларуская кухня — частка любога турыстычнага прадукту. У нашай арганізацыі вялікая база дадзеных аграсядзібаў, дзе можна пакаштаваць традыцыйныя стравы. Супрацоўнічаем з выкладчыкам БДУ Тадэвушам Навагродскім, які штогод праводзіць этнаграфічныя экспедыцыі разам са студэнтамі. Выдалі серыю кніг пра традыцыйныя стравы вёсак Семежава, Моталь, Тышкавічы, Гервяты, Стары Лепель. Дапамагае Аляксандр Чыкілеўскі, старшыня беларускай гільдыі паваароў. Эксперыментуе, адаптуе традыцыйныя стравы да сучаснасці.

Мы зараз робім кулінарную мапу Беларусі, каб прасунуць аграсядзібы і беларускую глыбінку ўвогуле праз ежу. Сустракаюцца неверагодныя стравы, якія больш нідзе не пакаштуеце. Напрыклад, у Карэліцкім раёне на сядзібе "Свіцязянка" частуюць халадніком на бярозавым квасе з агурэчнай травой. А іншыя адметныя беларускія стравы! Поліўкі розныя, клёцкі з душамі, кашы з вясковай печы… Гэта сялянская кухня. А была ж яшчэ кухня мяшчан і магнатаў: у Радзівілаў — судак з яблыкамі, ялавічына ў вішнёвым соўсе Святаполка-Мірскага… Агромністы спектр. А ўспрымаем мы сябе, вобразна кажучы, як "Дранік-лэнд" з плакату Цэслера. Хочацца гэты стэрэатып памяняць, прааналізаваць разам з экспертамі рэгіянальную кухню. Калі з'явіцца кулінарная мапа, на ёй будуць рэцэпты. Будзе інтэрактыў — націснуў на рэцэпт — з'яўляецца адрас аграсядзібы, куды паехаць, каб пакаштаваць гэту страву і навучыцца яе гатаваць.

Імкнемся прывабіць беларускай культурай моладзь. Я выкладаю курс па турызме на факультэце міжнародных адносін БДУ. Дала неяк заданне студэнтам апытаць аднагодкаў, ці ходзяць яны ў рэстараны беларускай кухні. Аказалася, што, вядома ж, не ходзяць: маўляў гэта "адстойная", "калгасная" ды яшчэ і нятанная справа.

Неяк мы патрапілі ў Моталь з галандскімі раварыстамі, якія хацелі зрабіць кулінарнае свята. Троху збіліся з маршруту і заехалі. Моталь я ведала, бо мне, дзяўчынцы з Мінска, у дзяцінстве замаўлялі там кажух. Адзінае месца было такое, самая прадпрымальная вёска. Галандцы ў Моталі пераночылі, сказалі: "Давайце будзем рабіць фестываль тут" — ну, і пачалося. У Моталі ёсць патомныя кілбаснікі, продкі якіх вазілі мясныя вырабы прадаваць у Варшаву. Маталяне не ведалі прыгону, бо жылі ў мястэчку з Магдэбургскім правам. Калгас тут узнік толькі ў 1956 годзе. Людзі заўсёды былі прадпрымальнымі, і гэта ў народзе захавалася.

Першы фэст "Мотальскія прысмакі" быў вельмі цікавым. Рабілі конкурс сярод бабуль, збіралі рэцэпты. Кожная яшчэ афармляла сваё "конкурснае" месца. За адну ноч з дапамогай мясцовай адміністрацыі нарабілі саламяных альтанак, налілі вады ў закінуты фантан, запусцілі карпаў… Бабулі не проста вынеслі стравы, а накрылі сталы абрусамі ўласнага вырабу, усё расклалі ў традыцыйны посуд. Галандцы прывезлі рэдактара часопіса "Бульён", які часта судзіць кулінарныя спаборніцтвы ў Заходняй Еўропе. Аказалася, што праца кулінарнага журы вельмі складаная: трэба было раскладаць на інгрыдыенты, соль, цукар… Гэта і праўда трэба судзіць прафесійна. Дарэчы, для галандцаў некаторыя беларускія стравы — цяжкія.

Пасля таго фэст ладзілі штогод, уцягнуліся. Летась зрабілі перапынак, летнік рамёствaў. У Моталі сталі адчыняць аграсядзібы, іх ужо пяць. У раёне шмат фальклорных гуртоў, цікавы музей у Моталі, а калгас пабудаваў гатэль.

Падсумоўваючы, магу сказаць, што наша грамадская арганізацыя падтрымлівае праявы лакальнай этнакультуры і папулярызуе іх.

Занатавала Алена ЛЯШКЕВІЧ

Рэпартаж з сёлетніх "Мотальскіх прысмакаў" — **у наступных нумарах "К".**

Гульня ўпоцемках Георгія Скрыпнічэнкі

Мастак Георгій СКРЫПНІЧЭНКА даўно мог бы займець журналісцкае таўро “беларускага Далі”. Для гэтага ёсць усе перадумовы, у тым ліку знешняе падабенства. Мог бы, калі б браў прыклад са знакамітага каталонца і дбаў пра ўласны піяр. Але айчыннаму жывапісцу і графіку, які пачаў ствараць сюррэалістычныя творы яшчэ паўстагоддзя таму, калі да слова “рэалізм” звычайна дапасоўвалася іншая прыстаўка, зусім не хочацца займацца піярам. Яму куды бліжэй цішыня ўласнай майстэрні.

Дамовіцца аб тым, каб правесці ў ёй нашу чарговую рэдакцыйную “планёрку”, было не надта проста. Мастак доўга пераконваў нас, маўляў, яму няма пра што нам распавесці. Але ў выніку больш як двухгадзіннай размовы мы атрымалі магчымасць зразумець: Скрыпнічэнка — гэта ніякі не Далі. Гэта менавіта Скрыпнічэнка.

Патрыхтаваў Ілья СВІРЫН / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

— У часы панавання сацрэалізму ваша творчасць была сапраўдным выклікам. Як вы здолелі адкрыць для сябе такую нязвыклую для тых часоў мастацкую з’яву?

— Адкуль гэта ўзялося — і сам не разумею. Дый ніколі і не задаваў сабе такога пытання, бо рабіў усё інтуітыўна, ішоў упоцемках. Я ж, лічы, хлопец вясковы, нарадзіўся ў простай сям’і — хаця мой бацька некалі і спрабаваў паступіць у Кіеўскі мастацкі інстытут, дарэчы, у адзін год са знакамітай у будучым украінскай мастачкай Таццянай Яблонскай. У дадатак, мне заўсёды падабалася класіка — Караваджа, Рэмбрант… Але неяк вось занесла ў іншы бок.

— Можа, гэта быў пратэст?

— Ды не, я ніколі не пратэставаў, хіба перад жонкай. Хаця многім чамусьці іначай здавалася. У 1965 годзе, незадоўга да заканчэння мастацкай вучэльні, я ўдзельнічаў у прэстыжнай Усесаюзнай маладзёжнай выстаўцы ў Мастацкім музеі. Выставіў нацюрморт з прасам і аўтапартрэт з лімонам — па сённяшніх мерках, працы даволі бяскрыўдныя. Але тады... Уявіце сабе — у адной газеце мяне назвалі “хунвэйбінам у мастацтве”! Потым ледзь з вучэльні не выгналі — “за фармалізм”. Шчыра ўдзячны сваім тагачасным выкладчыкам Леаніду Шчамялёву і Альгерду Малішэўскаму, бо толькі яны здолелі мяне тады адстаяць: маўляў, калі гэтага выкінем, каго ж тады пакідаць?

— Але відавочна, што сюррэалістычнай аўтарскай манеры вы абавязаны зусім не адукацыі...

— Калі мне давялося вучыцца, мы нічога нават і не ведалі пра тое, што рабілася тады на Захадзе. Інтэрнэту ж не было, па “целіку” — пару каналаў, за мяжу не выедзеш. Была толькі, памятаю, брашурка “Искусство капиталистического мира” з невялічкімі чорна-белымі здымкамі, прызначанымі ілюстраваць ступень маральнага разлажэння. Антырэклама дзейнічала адваротным чынам: мы разумелі, што Дзюшан і Полак — гэта геніі, а не вычварэнцы.

Памятаю, у 1963 годзе ў бібліятэку нашай вучэльні прывезлі кнігу пра Пікаса. Прозвішча мы чулі, але твораў не бачылі. Адразу з сябрамі пабеглі туды. Бібліятэкарка нікому гэты фаліянт не паказвала, толькі нам — дый тое цішком, каб начальства не ўгледзела. А калі я сам здолеў набыць у краме добры альбом таго ж Сальвадора Далі ды нармальна пазнаёміцца з ягонай творчасцю, на двары ўжо быў пачатак дзевяностых...

— Адкрыўшы, урэшце, той вялізны пласт культуры, які быў назапашаны ў XX стагоддзі, ці не прыйшлі вы да высновы, што ўсё жыццё займаліся вынаходніцтвам веласіпеда?

— А яго ўсе мастакі вынаходзяць, толькі ў кожнага свае колы! Да ўсяго, імкненні кагосьці “дагнаць і перагнаць” мне ніколі не былі ўласцівыя. Заўжды гатовы здацца без бою і прызнаць сябе нізэйшым.

— Вы згадвалі пра рэакцыю на вашу творчасць з боку прэсы ды “начальства”. А як рэагавалі калегі — тагачаснае арт-асяроддзе?

— Памятаю, прыходзяць да мяне ў майстэрню двое вядомых цяпер мастакоў, бачаць мае творы і кажуць: “А ты, Жора, усё сваіх крэтынчыкаў малюеш...” Тры разы мяне ў Саюз мастакоў не прымалі... Але я да ўсяго гэтага ставіўся неяк спакойна, без крыўдаў ды з гумарам. Ну калі сам крэтын, дык крэтынчыкаў і малюю, што з таго?

— Вас называлі эпатажным, смелым, вальнадумным... Як вы ставіцеся да падобных вызначэнняў?

— Ніяк не стаўлюся. Хтосьці называе эпатажным, хтосьці — бяздарным, хтосьці, падпіўшы, лясне па плячы: “Скрыпа, ты геній!” Калі надта пераймацца ўсімі гэтымі характарыстыкамі, лёгка ўшчэнт забіць свае мазгі шалупіннем.

— А вы самі ці адчуваеце сябе геніем?

— Гэта жонка мяне так называе, калі трохі злуецца і хоча пакпіць. Геніі, па вялікім рахунку, — Караваджа, Веласкес, Рэмбрант! А я — дробны мастачок, добра што хоць не правінцыйная самадзейнасць. Не, не бяздарнасць, дый нечага я такі дасягнуў — бо ўсё жыццё добра “ўкалваў”. Што б ні здаралася, заўсёды бег у майстэрню і там сядзеў дапазна.

— Многія вашы работы маюць дзве даты, прычым часавая разбежка паміж імі можа дасягаць некалькіх дзесяцігоддзяў. Звычайна ў мастакоў перыяды творчасці ідуць адзін за адным: першы скончаецца, пачынаецца другі, потым трэці. Але вы ў двухтысячныя вярталіся да карцін, распачатых у 60-ыя?

— Па-рознаму бывае. Магу і за тыдзень зрабіць твор, магу і гадамі над ім працаваць. Бывае, пачынаю — і пераскокваю на іншы, бо ён чамусьці больш вабіць. Але такое пытанне чую ўжо не ўпершыню: маўляў, як была ў цябе ў маладосці галава дурная, так і ў сталасці не паразумнеў. Можа, яно і так... Можа, гэта цэльнасць, а можа, і аднабокасць. Халера яго ведае, не мне меркаваць. А чаму вяртаюся? Бо назапашваецца з цягам часу майстэрства і досвед. Нешта дадаеш, перарабліваеш, выпраўляеш хібы...

— У цяперашні час пісаць сюррэалістычныя карціны вельмі няпроста...

— А што бывае простым у мастацтве?

— Няпроста, бо ёсць вялікая рызыка скаціцца ў кітч альбо ў эпігонства?

— Эпігонства — наўрад ці, бо я ўпарта стараюся трымацца свайго. А вось кітч... Прымяняльна да сваёй творчасці першы і апошні раз я чуў гэтае слова на выстаўцы ў Дзюсельдорфе, арганізаванай мастацтвазнаўцай Таццянай Бембель. Нехта з гледачоў ахарактарызаваў мае творы кітчам. Я быў не тое што абураны, але, хутчэй, моцна здзіўлены: ніколі б пра сябе такога не падумаў. Як па мне, кітч — гэта, напрыклад, Эндзі Уорхал са сваёй бляшанкай супа “Кэмпбел”. Можа, у пэўным сэнсе і нядрэнныя рэчы. Проста — не маё! Але калі хтосьці бачыць у маіх творах кітч — калі ласка, няхай бачыць!

— Сваёй творчасцю вы як бы “задалі лінію” цэлай плеядзе мастакоў: Селяшчук, Тоўсцік, Савіч...

— Не, нічога я не задаваў, мы развіваліся паралельна. Пералічаныя мастакі — гэта мае сябры, ні пра якое перайманне і лідарства тут і блізка казаць не выпадае. Кожны рабіў сваё, кожны рушыў уласным шляхам, але недзе мы, вядома, перасякаліся. Коля Селяшчук сам прызнаваўся, што сёе-тое ў мяне падгледзеў. Але гэта нармальна — мы ўсе адзін у аднаго цішком нешта хапаем і цягнем да сябе.

— А як у вас складваліся стасункі з найбольш уплывовымі мастакамі свайго часу — тым жа Міхаілам Савіцкім, які вядомы паслядоўным адстойваннем акадэмічных традыцый?

— Па шчырасці, шчыльных стасункаў і не было. Хіба, часам заходзіў да яго ў майстэрню на кубачак кавы ці каб пару рублёў да заробку перахапіць. Але магу прыгадаць такі паказальны выпадак. Раней мастакі прадавалі свае працы дзяржаве, складаючы з ёй дагаворы. У камісіі Міхаіл Савіцкі граў вырашальную ролю, ад яго слова залежыў дабрабыт многіх творцаў. Натуральна, да яго хадзілі, прасілі, “шукалі падыход”... Але ўсё марна: суддзя гэты быў строгі ды няўхільны. Камусьці ён мог зрэзаць ганарар, кагосьці ўвогуле “засекчы пад корань”... Аднак падчас разгляду маёй графікі ён нечакана для ўсіх прапанаваў не панізіць ганарар, а павысіць, з 300 рублёў за аркуш да 450 — за выдатны мастацкі ўзровень. Для мяне гэта, вядома, было неспадзяванкай, тым больш, у творчым плане мы з Савіцкім і сапраўды вельмі розныя.

— Цікава, а што гэта былі за работы?

— Калі не здраджвае памяць, серыя называецца “Свет і космас”. Вясковая жанчына калыхае дзіця, а недзе на далёкім плане — прыкметы сучаснай цывілізацыі. Я з задавальненнем рабіў працы на актуальную тады касмічную тэматыку, але рабіў іх па-свойму. І за атрыманыя вынікі мне ніколі не было сорамна.

— У СССР мастакі лічыліся прывілеяваным саслоўем — як у сацыяльным, так і ў эканамічным плане. Ці няма настальгіі па тых часах?

— Ужо пабыўшы ў Францыі, Борка Забораў неяк наведаўся ў Мінск і сказаў пры сустрэчы: з пункту гледжання фінансавага камфорту ў Савецкім Саюзе для мастакоў — сапраўдны рай! Ёсць і дзяржзамовы, і калгасы з заводамі аздабляць можна, і бясплатныя майстэрні, і процьма іншай халявы... За мяжою варункі зусім іншыя, але затое там ніхто не ўнурваецца ў тваю творчасць і не кантралюе. Цяпер і ў нас няма жорсткай кан’юнктуры альбо кантролю з боку дзяржавы, нікому надта не цікава, што ты там малюеш. І з гэтай нагоды я толькі радуюся. Таму якая тут можа быць настальгія?

— Не кантралююць, але і не плацяць. Раней малюючы тое, што трэба, можна было зарабляць шалёныя па тых часах грошы...

— Я гэтай магчымасцю тады не скрыстаўся. Памятаю, намалюеш вокладку для кнігі, атрымаеш якіх сто рублёў у дадатак да свайго 90-рублёвага заробку ва Усесаюзным НДІ тэхнічнай эстэтыкі — і можаш цэлы месяц сядзець у майстэрні ды спакойна рабіць тое, што табе падабаецца. Для мяне галоўным было мастацтва, і менавіта яго я заўсёды выбіраў.

Вядома, нешта пры гэтым я і губляў, іначай жа не атрымліваецца. Сям’я пакутавала ад безграшоўя. Бывала, з жонкай хадзілі заручальны пярсцёнак прадаваць цыганам пад кінатэатр “Змена”. Цесць, далёкі ад мастацтва, мяне заўжды пілаваў: маўляў, хоць бы Брэжнева намаляваў якога!

— А якое ваша стаўленне да заказу ў мастацтве?

— Цяжка сказаць. Я амаль ніколі не рабіў пад заказ, а калі рабіў, то вельмі па-свойму. У тым жа НДІ эстэтыкі распрацаваў упакоўку для торта ў выглядзе дзвюх птушак, якая надоўга прыжылася на паліцах крамаў. Цэтлікі для бутылек маляваў — вядома ж, уручную, дбайна выпісваючы кожную літарку. А кан’юнктуры заўсёды цураўся, абіраючы нейтральныя тэмы. Прыкладам, я не спазнаў вайны на ўласным досведзе, дык што ж я магу на гэтую тэму сказаць, каб яно не гучала фальшыва?

Але варта тут згадаць, што і Леанарда, і Рафаэль, і многія-многія іншыя працавалі амаль выключна на замову — і ў выніку паўставалі шэдэўры! Хаця цяперашняе разуменне заказу і тагачаснае — зусім розныя. Тады “валадары жыцця” мелі выкшталцоны густ і не прымушалі мастака прыпадабняцца да прадстаўнікоў найстаражытнай прафесіі.

— Многім мастакам цяпер даводзіцца працаваць, што называецца, у шуфляду, не адчуваючы рэакцыі гледача...

— Ну дык і шыкоўна, радуйся, што ў цябе ёсць такая магчымасць! Тым больш, не можа быць такога, каб зусім не было кантакту з гледачом, мы ж не на бязлюднай выспе. Сёе-тое адбываецца. Мяне вось у Полацк не так даўно паклікалі, цяпер у Баранавічы...

— А ці запатрабаваны мастацкія выстаўкі ў такіх гарадах, ці ёсць там адпаведны глядач?

— Шчыра кажучы, не пераймаўся гэтым пытаннем. Каму трэба, той пойдзе. Мяне вось турбавала зусім іншае — куды свае работы падзець? Тым больш, мы не вечныя, і рана ці

позна майстэрню давядзецца вызваляць... Ну, нешта можна раздаць сваякам і сябрам, але колькі карцін змесціцца ў звычайную кватэрку? Адна, дзве, пяць. А ў мяне іх назапашаны тысячы. Зрэшты, выйсце з гэтай сітуацыі я ўжо знайшоў. Дзякуючы шчаслівай аказіі, здолеў абмяняцца і займець аднапакаёўку літаральна ўсутыч да майстэрні. Цяпер гэта — сховішча маіх твораў.

— Няўжо работы такога вядомага мастака не знаходзяць пакупнікоў?

— Памятаю, яшчэ ў савецкі час пачуў ад аднаго калегі: вось, маўляў, у мяне сем работ у майстэрні завіслі, і не ведаю, куды іх прыткнуць. Мы з Колькам Селешчуком пераглянуліся і кажам адзін аднаму: у нас такіх сотні, але мы шчаслівыя, што яны застаюцца з намі. Вядома, жыць з нечага трэба, і пэўнага поспеху ў плане продажу я дасягнуў — прынамсі, цяпер зусім не жабрую. Але мэты "абы прадаць" ніколі перад сабой не ставіў. Калі да мяне прыйдзе нейкі багацей і папросіць падабраць карціну для сваёй кухні, я пашлю яго куды падалей. Іншая справа — калекцыянер альбо галерэя. І мне шчасціць з такімі пакупнікамі.

— "Соцзаказ" замяніла кан'юнктура арт-рынка, які мае свае законы, часам даволі жорсткія. Ці можа мастак заставацца вольным у гэтых варунках?

— Можа, чаму ж не? Усё залежыць выключна ад цябе. Калі я прыехаў да сяброў у Манрэаль, тыя пазнаёмілі мяне з дырэктарам буйной галерэі. Пабачыўшы мае творы, ён адразу прапанаваў кантракт: на табе і аванс, і ўсё, што трэба для працы... Але адна ўмова: штомесяц ты мусіш рабіць пэўную колькасць твораў. Не вагаючыся, я адмовіўся — свабода мне даражэй. Я магу столькі твораў і за тыдзень зрабіць, а магу і за год. І ніхто не павінен мне ўказваць!

— Адпаведна, выбар на карысць унутранай свабоды заўсёды складаны ды пакутлівы...

— А як жа іначай! Калі страчваеш свабоду — ты не мастак. Вядома, абсалютная свабода ў прыродзе не сустракаецца, бо ў жыцці мы ўсе ад кагосьці ці ад чагосьці залежым — прынамсі, адзін ад аднаго. Але ў сваёй майстэрні, у сваім уласным свеце я ніколі ні на кога не зважаў. І цяпер шчаслівы, што здолеў пазбегнуць гэтай крывадушнасці.

— Як вы ўвогуле сталі мастаком?

— Мае дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Слуцку, дзе мяне ведала ці не палова горада — як стылягу, які насіў вузкія штаны і кашулю навыпуск. У такім выглядзе тады на танцы не пускалі. Затое ў Палацы піянераў была студыя, якой кіраваў выбітны педагог Уладзімір Садзін. Апрача мяне яе наведвалі таксама Міша і Вова Басалыгі, а таксама мой вельмі блізкі сябра, які быў ці не самы таленавіты з нас усіх, — Коля Карзоў. Дзякуючы такому атачэнню, я і захапіўся маляваннем усур'ёз.

Памятаю, застаўся я ў дзявятым класе на другі год, і бацька ў "выхаваўчых мэтах" адправіў мяне на будоўлю Салігорска. Праца была цяжкай, але вольная хвілінка для эцюдаў знаходзілася. І вось, вяртаючыся ў Слуцк напрыканцы працоўнага тыдня, я зазвычай вёз паказаць свайму настаўніку цэлую кіпу накідаў — здаралася, па тры сотні. А ўжо потым была вучэльня...

— А вы самі ці займаліся калісьці педагагічнай дзейнасцю?

— Хіба адзін раз у жыцці, на трэцім курсе вучэльні. Мяне неспадзявана папрасілі замяніць школьнага настаўніка крэслення. Шчыра кажучы, я ў гэтым нічога не цяміў, таму на ўсіх уроках чытаў шкалярам "Маленькага прынца", а яны мяне ўважліва слухалі. Настаўнікі здзіўляліся: чаму ў такім шалёным класе стаіць цішыня?

Болей жаданне выкладаць ніколі ў мяне не з'яўляліся. Я ўвогуле не разумею выраз "мае вучні", бо не ўспрымаю сябе як такі ўжо непарушны аўтарытэт.

— Ці падабаецца вам цяперашні ўзровень беларускага выяўленчага мастацтва? Развіваецца яно, альбо... наадварот?

— Я добра паездзіў па свеце, многае бачыў і таму магу сказаць, што агулам мастацтва ў нас вельмі нядрэннае. Ёсць багата асобаў, якія знайшлі свой уласны непаўторны творчы почырк: скажам, Уладзімір Савіч альбо Зоя Літвінава. Даўно пераадолена тая аднабокасць, якая была пры сацрэалізме — хаця і ў тую эпоху з'яўляліся свае майстры. Увогуле, гэты прынцып характэрны для любой эпохі: заўсёды ёсць асобы, а ёсць — багна. Бо самае галоўнае — нейкі твой унутраны парастак, які няспынна трэба развіваць. Калі будзеш упарта рабіць сваю справу, шукаць, адкідаць усё лішняе, поспеху ты немінуча дасягнеш.

— У беларускім выяўленчым мастацтве багата творчых дынастый, але ж ваш сын Сяргей пайшоў па іншай каляіне — ён вядомы перадусім як рок-музыкант, лідар гурта "Zygimont Vaza".

— А ён, дарэчы, у юнацтве таксама пайшоў мастакоўскім шляхам, паступіў у Акадэмію. Мае і талент, і мазгі, але... ўрэшце застыў. Мне мае сябры-мастакі шмат казалі: паўплывай ты неяк на свайго сына. Але як я магу на яго ўплываць?

— Ці быў у вашым жыцці такі чалавек, які сказаў бы: "Жора, ні ў якім разе не кідай маляваць?"

— Ды што вы, я б пагнаў яго з хаты… Наадварот, з дзяцінства маё захапленне выклікала ва ўсіх даволі паблажлівае стаўленне: "Каму што, а Жорку — маляваць…". Іншая дзятва дык справай займаецца: хтосьці яблыкі пайшоў красці, хтосьці — па вішні... А Жорка — як заўсёды лухтой маецца. І каб Жорка сам не прагнуў стаць мастаком, дык ніколі ім бы не стаў. Таму я адразу разумеў, што прымусу тут ніякага і быць не можа. Тым больш, Сяржук таксама знайшоў свой шлях — засвоіў камп'ютар куды лепш за мяне, сёння працуе дызайнерам і нават мае ў сваім актыве прызы міжнародных конкурсаў.

— А ці падабаецца вам яго музыка?

— Увесь час чую пра яе добрыя водгукі ад сваіх сяброў ды знаёмых, але... сам, прызнацца, не слухаў. Бывае, прыйдзеш да Сяржы на дзень нараджэння, папросіш нешта ўключыць, а ён кажа: ай, тата, ну яго, не зараз...

— Цікава, а як у вас наладжваліся стасункі з тусоўкай сына — музыкантамі, што гралі цяжкі рок?

— Жонка ўвесь час казала: чаго ты, здаровы конь, з гэтай дзятвой возішся ў пясочніцы? А я з імі і чарку мог узяць, і пагутарыць душэўна... Таму стасункі — выдатныя! Для мяне ўвогуле няма вялікай розніцы, ці перада мной народны мастак сядзіць, ці нейкі маладзён зялёны.

— Досыць часта ў вашых палотнах так ці іначай закранаецца нацыянальная тэма. Калі ў вас узнікла да яе цікавасць?

— Па шчырасці, досыць позна. Адкуль у нас маглі быць нацыянальныя пачуцці? У Слуцку майго дзяцінства беларускае слова гучала амаль паўсюдна, але ж у школе мы збольшага па-руску вучыліся, а роднай мовай грэбавалі: ай, "на белку" не пойдзем... Менавіта праз такое стаўленне і з'яўляліся людзі, якія і не рускія, і не беларусы, а ўвогуле няведама хто.

Для мяне абуджэнне прыйшло ўжо ў сталым узросце, недзе ў 80-я. Паспрыялі тыя калегі, якія заўсёды



■ Потым ледзь з вучэльні не выгналі — "за фармалізм". Шчыра ўдзячны сваім тагачасным выкладчыкам Леаніду Шчамялёву і Альгерду Малішэўскаму, бо толькі яны здолелі мяне тады адстаяць: маўляў, **калі гэтага выкінем, каго ж тады пакідаць**?



■ ...імкненні кагосьці "дагнаць і перагнаць" мне ніколі не былі ўласцівыя. **Заўжды гатовы здацца без бою і прызнаць сябе ніжэйшым**.

■ Калі страчваеш свабоду — ты не мастак. Вядома, абсалютная свабода ў прыродзе не сустракаецца, бо **ў жыцці мы ўсе ад кагосьці ці ад чагосьці залежым** — прынамсі, адзін ад аднаго. Але ў сваёй майстэрні, у сваім уласным свеце я ніколі ні на кога не зважаў.



гаварылі па-беларуску. Вельмі дзіўна тады было чуць беларускую мову недзе ў краме альбо, скажам, у кіно. І гэтыя прыклады вельмі натхнялі.

— Многія задаюцца пытаннем: як змяніць сітуацыю? Як паўплываць на масы, каб яны і Радзіму любілі, і мастацтвам цікавіліся...

— У нашых умовах самае галоўнае — не перабольшваць са сваім уплывам, бо занадта рашучымі дзеяннямі можна толькі шкоду ўчыніць. Але нічога не рабіць, вядома ж, таксама не выпадае. Цікавіцца гісторыяй і культурай нельга прымусіць, а вось выхоўваць такую цікавасць трэба. Прычым пачынаючы не пазней, чым з дзіцячага садку.

— Сёння шмат гаворыцца пра сацыяльную функцыю мастацтва. Ці можа творца зрабіць гэты свет лепшым?

— Лічу, што кожны проста павінен рабіць уласную справу. Пішы свае карціны на выдатным узроўні — і менавіта ў гэтым праявіцца твая актыўная грамадзянская пазіцыя. Галоўнае, каб яны ішлі знутры, ад сэрца. Бо іначай будзе тая самая кан'юнктура, пра якую мы ўжо казалі.

— Цяперашняе беларускае мастацтва імкнецца інтэгравацца ў сусветную прастору. Ці застанецца яно пры гэтым нацыянальным?

— Думаю, так. У нас свая школа, свой падыход, сваё бачанне... І, вядома ж, гэта вельмі добра. У кожнай краіне ёсць нейкі каларыт, і ён добра адчуваецца збоку. Калі ты ідзеш у парыжскі музей, дык спадзяешся пабачыць там перадусім французскае мастацтва. Напэўна, неабыякаваму да культуры замежніку таксама будзе цікава пазнаёміцца ў Мінску менавіта з мастацтвам беларускім. Сапраўды, сучасныя праявы творчасці размываюць паняцце нацыянальнага. Але... наколькі б ты ні быў сучасным, крывінку не падманеш!

— А што такое беларускае нацыянальнае мастацтва для вас?

— Пакуль што гэтае паняцце ў нас трохі размытае, як яго можна акрэсліць, я нават і не ведаю. Пэўна, патрэбны час, каб яно выкрышталізавалася. Шмат што адамрэ, але ўжо відавочна, што многае і застанецца. Тая ж Алена Кіш, напрыклад... Вядома, гэта нацыянальнае мастацтва.

— Напэўна, найвялікшую вартасць маюць тыя творы, якія ўжо выйшлі за нацыянальныя межы. Прыкладам, Рафаэль — не італьянская з'ява, яна родная для кожнага чалавека...

— Сапраўды, гэта мастацтва найвышэйшага гатунку. Але ж пры ўсім пры тым Рафаэль — усё адно італьянскае мастацтва! Гэта сусветны геній, побач з якім мне сорамна згадваць сваё прозвішча, але гэта — італьянскі геній. І калі ты трапляеш у фларэнтыйскую галерэю Уфіцы, дык разумееш, што ты не ў Германіі альбо Англіі, а ў Італіі.

— У вас вельмі шмат карцін, створаных у розных кутках Беларусі. Напэўна, вы любіце падарожнічаць?

— Апошнім разам, літаральна месяц таму, выпраўляліся з калегамі на Браслаўшчыну: Слабодка, Мёры, Друя... Выдатныя мясціны, першы раз там быў. Пісалі штодня па дваццаць эцюдаў! Пры ўсіх сваіх "завіхрэннях", адлюстраванне прыроды мне заўсёды было блізкім. Тым больш, не бывае ні аднолькавых мясцін, ні нават аднолькавага ўспрыяцця аднаго і таго самага месца.

— Скажыце, а назвы карцін вы самі прыдумляеце? Адкуль у іх столькі паэзіі?

— Сам. Паэтычнасць — гэта дзякуючы паэзіі, якую я вельмі люблю: ад Байрана да Хлебнікава. А ў Колькі Селешчука, які таксама хлопец вясковы, адкуль яно — "Канец сезона туманаў"? Значыць, нешта ў нас, напэўна, ёсць унутры...

— Цяпер рэпрадукцыі твораў Селешчука выстаўляюцца на плошчы Якуба Коласа. Ці імпануюць вам падобныя праекты?

— Вядома. Ці даведалася б пра Колю цяперашняя моладзь, каб не такія выстаўкі? А так людзі ходзяць, глядзяць... Месца абранае вельмі ўдала. Тыдні два таму абмяркоўвалі гэты праект з Наташай Шаранговіч, і яна прапанавала наступным разам мне ў ім паўдзельнічаць. З радасцю пагадзіўся. А вось на "паркане" я б не хацеў выстаўляцца — мне падаецца гэта нечым легкаважным. Вядома, хай будзе, я не супраць і не хачу нікому навязваць сваё меркаванне. Гэта як тэлеканалы: не падабаецца — пераключыў.

— Як вы ставіцеся да пытанняў кшталту "Патлумачце, што намалявалі"?

— Калі ў мяне была вялікая выстаўка ў Нацыянальным мастацкім музеі, мяне запрашалі правесці сустрэчы з гледачамі, выказаць ім свае думкі Але я не люблю гэтага. У некага яно добра атрымліваецца, а я вось — не ўмею. Можа, нават і ўмею — але не хачу. Хай тлумачэннем займаюцца спецыяльна навучаныя людзі, якім, тым болей, за гэта плацяць. Бывае, нехта з мастацтвазнаўцаў мне самому вочы расплюшчыць на ўласную творчасць.

Я ўвогуле не надта схільны да аналізу. Не люблю сваю творчасць ацэньваць, не люблю філасофстваваць на гэты конт. Вось і цяпер перад вамі пачуваюся трохі няўтульна — як на рэнтгене. Я проста жыву як жывецца. Калі перад аслом павесіць жмут саломы, ён будзе да скону рушыць наперад, каб тую салому дастаць — дый так і не дасць сабе рады. Вось і са мной такая гісторыя выйшла: раблю ды раблю, а што з гэтага атрымліваецца — ужо не мне меркаваць. Тым больш, і сэнсу ў гэтым не бачу — усё на халсцінах відаць. Альгерд Малішэўскі некалі добра сказаў: у мастака-"філосафа" па вусным пяць, а як па пісьмовым?

— Творцаў ужо не першае стагоддзе называюць "багемай". Ці прымяняльнае гэтае слова да нашых мастакоў? Ці ёсць у нас пэўнае арт-асяроддзе?

— Калі ў мяне была персанальная выстаўка ў Нацыянальным мастацкім, я запрасіў сваіх сябрукоў, накрыў для хлопцаў сталы, зрабіў добрую бяседу. І мастакі мне ў адзін голас расчулена дзякавалі: "Скрыпа, дзякуй, што ты нас сабраў!" Бо цяпер гэта надзвычай рэдка здараецца. Раней мы ўвесь час соўгаліся адзін да аднаго па майстэрнях, гадзінамі гутарылі за "келішкам гарбаты". А ў наш час усе сядзяць па сваіх норах, і кожная нагода адтуль выбрацца становіцца сапраўдным святам.

— Ваш імідж — ён прадуманы, альбо так склалася? Гутарка, вядома, перадусім пра закручаныя ўгору вусы.

— Калі ў мяне была звычайная бародка, насагубная складка надта вылучалася на фота — як быццам на твары маска. Напрыклад, ёсць у мяне здымак беларускай дэлегацыі ў Рыме: усе прыгожа пасміхаюцца, адзін толькі я атрымаўся нейкі скасабочаны з-за ценю ад вусоў. І таму дзеля гумару я стаў падкручваць іх — як у Сальвадора Далі. Цікава было павыдурняцца.

— Адпаведна, гэта быў момант "гульні ў класікі"?

— Мастацтва — гэта ўвогуле гульня, самая натуральная. І хто лепей гуляе, той лепшы мастак.

— А хто ў ёй выйграе?

— Мастак і толькі мастак! Не трэба тут пра гледачоў альбо, скажам, пра грамадства. Мы эгаісты да мозга касцей!

К

Тэатральная плошча

На раздарожжы "Балетнага лета"

Завяршаць оперна-балетны сезон фестывальным суквецем ператвараецца, падобна на тое, у яшчэ адну "нацыянальна акадэмічную" традыцыю. Ужо другі год запар да пленэрна-выязных спектакляў і канцэртаў "Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў" далучалася "Балетнае лета ў Вялікім". Наколькі ж вялікім — ва ўсіх сэнсах слова — стаўся сёлетні харэаграфічны форум?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фестывальная праграма складалася пераважна з рэпертуарных балетаў нашага тэатра, але з запрошанымі салістамі: "Лебядзінае возера" і "Жар-птушка" з Аляксандрай Цімафеевай (Расія), "Лаўрэнсія" з Лалі Кандэлакі (Грузія), "Жызэль" з былой нашай Кацярынай Борчанка (Расія). Такая форма — па сутнасці, звыклая тэатральная завядзёнка, што даўно і трывала практыкуецца як адна з галоўных там, дзе салісты працуюць выключна па кантрактах. У нас жа запрошаныя зоркі часцей спяваюць у операх — і для большага прыцягнення публікі, і з-за нястачы сваіх галасоў (найперш драматычных тэнараў, на якіх разлічаны ледзь не ўвесь наш рэпертуар). У балеце ж — і без таго ўсяго хапае: і квіткі ў імгненне "змятаюцца" (асабліва на праслаўтых "лебедзяў"), і з салістамі — на першы погляд, поўны "камплект" (пра пошук яркіх індывідуальнасцей, асабліва сярод моладзі, — размова асобная). Так што да таго часу, пакуль такія запрашэнні не сталі надта частымі, яны могуць успрымацца менавіта фестывальнай адмецінай — незалежна ад узроўню і вядомасці замежных артыстаў.

Сцэна з балета "Хто я?" Сяргея Картэса.

Алена Шкатула (Эстонія) і Дзяніс Клімук (Беларусь). / Фота прадастаўлены тэатрам

Куды больш цікавы і перспектыўны кірунак фестывальнага руху — запрашэнне гасцявых спектакляў. Сёлета гэта была двухактовая пастаноўка "Рамэа і Джульета" Санкт-пецярбургскага акадэмічнага тэатра балета імя Л.Якабсона, якая ў чарговы раз даказала, што аднайменны спектакль нашай трупы, пастаўлены ў 1988-м Валянцінам Елізар'евым, на некалькі парадкаў вышэй.

У выніку з сямі фестывальных вечароў найбольш цікавымі аказаліся два апошніх: вечар сучаснай харэаграфіі, амаль цалкам заснаваны на прыдумках нашых балетмайстраў, і гала-канцэрт, дзе акрамя класікі было багата сучасных нумароў, у тым ліку прэм'ерных беларускіх, якія можна было параўноўваць з новымі харэаграфічнымі працамі не толькі расійскімі, але і сусветнымі. Але ж чаму такія канцэртныя праграмы — не абавязкова з удзелам замежных зорак, але і проста свае, беларускія — усё яшчэ застаюцца гэткім фестывальным ноў-хаў замест таго, каб даўно ўжо быць у рэпертуары? Пагаджуся: любы фестываль прагне чагосьці прэм'ернага. Але пасля ўсё лепшае павінна ўпрыгожваць афішу, а не хавацца ў "запасніках" з прыцэлам на замежныя, часцей конкурсныя паездкі нашых салістаў.

У гэтым плане оперная трупа значна апярэджвае балетную: пры куды меншай загружанасці некаторых салістаў тыя пасляхова рэалізуюць сябе ў тэматычных і часта тэатралізаваных канцэртных праграмах, якіх становіцца ўсё больш. Згаданая тэндэнцыя тэматычных тэатралізаваных канцэртаў выявілася і на цяперашнім фестывалі. Вольга Костэль, маючы добрае ўяўленне пра замежныя традыцыі ў гэтай галіне, пасляхова сумяшчае іх з актуальным для нашых рэалій асветніцтвам. "Танец у плыні часу", які склаў суцэльнае аддзяленне, стаўся і рэфлексічным роздумам пра мукі творчасці, і своеасаблівай "лекцыяй з ілюстрацыямі", прысвечанай харэаграфічным кірункам і стылям.

Прызнацца шчыра, сучасныя беларускія нумары былі рознымі па ўзроўні. Многа было "ніякаватых", безаблічных, заснаваных на "агульных формах руху", узятых з класікі розных стагоддзяў, але не прыведзеных да нейкай адзінай ідэі. На такім фоне (і адначасова на фоне "ўсялякіх і добрых", папраўдзе адметных замежных пастановак) вылучалася "жывая класіка" колішняга выхаванца В.Елізар'ева, сусветна вядомага Раду Паклітару, а таксама глыбокія па думках балетмайстарскія спробы Канстанціна Кузняцова і Юліі Дзяткоў — "неафіцыйных" вучняў Р.Паклітару (у нас ён ставіў пераважна на іх дуэт, у шчыльным супрацоўніцтве з танцоўшчыкамі). У фестывальнай атмасферы па-новаму ўспрымаўся і іх аднаактовы балет "Хто я?".

Уласна беларускую праграму расквецілі таксама дэбюты — у прыватнасці, розныя па жанрах нумары, пастаўленыя на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Падобную практыку прыцягнення на вялікую сцэну (не абавязкова адразу фестывальную, а з папярэдняй "абкаткай") лепшых дыпломных прац трэба было б працягнуць, бо гэта быў бы дадатковы стымул як для навучэнцаў, так і для майстроў: маўляў, новае пакаленне наступае на пяты.

Ды ўсё ж самым галоўным, безумоўным і неаспрэчным здабыткам цяперашняга фестывалю стала запрашэнне на яго Улькер Аліевай з Азербайджана — не артысткі балета ці харэографа, а доктара мастацтвазнаўства, аўтара чатырох кніг (апошняя з іх, прысвечаная музычнай выяўленчасці і карціннасці, была выдадзена ў Германіі і ўключана ў каталог "Вынаходніцтвы ў музыцы"). Штовечар Улькер глядзела фестывальныя спектаклі і канцэрты, а зранку на сайце тэатра з'яўлялася яе рэцэнзія на ўчарашнія падзеі, вытрыманая па ўсіх правілах удзячнай добразычлівасці і "палітыкеса", але разлічаная на "чытанне між радкоў". Ды што там казаць, калі яе матэрыялы, да ўсяго, давалі такі неабходны "погляд збоку", адкрыты літаральна для ўсіх.

Сам жа фестываль пакуль на раздарожжы і яшчэ не вызначыўся, якой мадэлі яму прытрымлівацца далей. Сёлетні ж атрымаўся напалову "летнім", разлічаным на "адпачынкавую" публіку, з відавочным камерцыйным адценнем. А напалову — канцэпцыйным, скіраваным да сучасных павеваў у харэаграфіі. Былі прапановы праводзіць у яго межах конкурс, але гэта пакуль хіба адна з магчымых перспектыў. Бо на сёння ўсё вызначаюць грошы, і ўжо адно тое, што такі фестываль існуе, з'яўляецца значнай заваёвай тэатра.

К

Для фестывалю — усё самае лепшае! Пэўна, такой думкі прытрымліваліся ў Беларускім тэатры "Лялька", калі ў праграму сёлетняга "Лялечнага квартала" на "Славянскім базары ў Віцебску" ўключылі, акрамя штогод бяспройгрышных "Брэменскіх музыкаў", яшчэ і сваю нядаўнюю прэм'еру — казку Ш.Перо "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі". Гэтым жа спектаклем тэатр завяршаў 29-ы сезон.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Папялушка-беларусачка

Лялечныя спектаклі для дзяцей, пастаўленыя ў нас апошнім часам, знаходзяцца быццам на двух полюсах. На адным — цалкам традыцыйныя пастаноўкі, разлічаныя хіба на тых, хто нічога раней не бачыў і ў тэатры ўвогуле ўпершыню. На другім полюсе — адметныя творчыя эксперыменты, не заўсёды, на жаль, зразумелыя дзецям. Спектаклі, разлічаныя на сямейныя прагляды і папраўдзе цікавыя не толькі дзецям розных узростаў, але і іх бацькам ды бабулям-дзядулям, узнікаюць хутчэй як выключэнне. Тым больш прыемна, што чарговым такім "выключэннем" стала віцебская "Папялушка".

Адметнасць пастаноўкі, ажыццёўленай мастацкім кіраўніком тэатра Віктарам Клімчуком, — гэта зварот да эпохі Людовіка XIV, сучаснікам якога быў і Шарль Перо. Барочная атмасфера ствараецца яшчэ да пачатку спектакля — праз два крэслы з музычнымі інструментамі, выстаўленыя на авансцэне (сцэнаграфія Алеся Сідарава). Не парушаецца яна і з пачаткам дзеі, і гэтаму спрыяюць сцэнічныя строі (лялькі і касцюмы — Ганны Сідаравай), пластыка артыстаў, стылізацыя тагачаснай музыкі і сам прынцып камернага музіцыравання (спалучэнне лютні, дзвюх флейт, скрыпкі), распаўсюджаны тады пры каралеўскім двары. Дый у сюжэтнай канве ёсць невялічкая спасылка на арыгінальны, не парушаны шматлікімі далейшымі інтэрпрэтацыямі змест. Хаця і выкрэслена ўласцівая казкам Перо павучальна класіцысцкая мараль (вершаваныя радкі пра тое, што хросныя бацькі бываюць нават лепшымі за родных генетычных), усё ж Фея, пазначаная так і ў праграмцы, унутры тэксту завецца Хроснай.

Але ж барочнасць спектакля мае і свае нацыянальныя "адмеціны". Так, Георгій Каржанеўскі ўбачыў у пастаноўцы відавочны намёк на Казіміра Малевіча: маўляў, сама сцэнічная прастора ўяўляе з сябе гэткі "чорны квадрат" (заўважым, усё ж хутчэй прамавугольнік), адкуль, бы з касмічнай "чорнай дзіркі", з'яўляюцца героі. Прасачыў віцебскі журналіст і сувязі самога "чарноцця" з эстэтыкай барока. Асабіста ж я ўбачыла беларускасць спектакля ў іншым. Строі артыстаў, пашытыя "па апошняй барочнай модзе", заснаваныя на зусім іншых колеравых спалучэннях. Замест прынятых тады "парчы ды золата" — шэранькі арнамент, які бывае на саматканых льняных ручніках, посцілках, іншых народных вырабах. Але ж ці магчыма такое звышдэмакратычнае спалучэнне прыдворных фасонаў з народнай арнаментыкай? Для Рэчы Паспалітай — цалкам, бо становіцца яшчэ і сімвалічным: узгадаем беларускую традыцыю, апісаную У.Караткевічам у рамане "Каласы пад сярпом тваім", пасылаць шляхецкіх парасткаў у сялянскую сям'ю — на год, у якасці "вытворчай практыкі", што папярэднічала іх замежнай адукацыі.


Сцэны са спектакля "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі."

"Беларускі элемент" выявіўся і ў тым, што бацька Папялушкі ператварыўся ў Ляснічага (Валерый Зімніцкі) — і адразу асацыятыўныя нітачкі працягнуліся да такіх знакавых твораў нацыянальнай класікі, як "Тарас на Парнасе" і "Новая зямля". А тое, што Кароль асабіста, без усялякіх ганцоў-вяшчальнікаў запрашае сям'ю Ляснічага на баль, становіцца не "казачнай" фантазіяй-недарэчнасцю, а яшчэ адным сімвалам згаданага шляхетнага дэмакратызму.

На жаль, такая беларускасць вытрымана не ва ўсім. Лялькі Мачахі і Сёстраў апрануты ў стылі Барбі, хаця гэта і можа быць апраўдана "асучасненнем" сюжэта. Лялька Караля (Яўген Гусеў) сваім бліскуча залатым балахонам нагадвае казачна-батлеечных цароў, а магла б увасабляць "партрэт з роду Радзівілаў".

Сумяшчэнне эпох чуецца і ў музыцы Алега Залётнева, дзе стылізацыя барока суседнічае з сучаснымі павевамі і эстрадай. Праўда, ведаючы прафесіяналізм кампазітара, ад гукавай палітры спектакля чакаеш большай канцэпцыйнасці. Бо ўсяго два кароткія песенныя фрагменты (Папялушкі і каралеўскіх служак, якія павінны прымяраць усім пантофлік) не могуць стварыць антытэзу астатняй інструментальнай стыхіі, успрымаючыся ці то залішнімі, ці то "недаспяванымі". Цэласнасць музычнай фонасферы дасягаецца хіба праз аранжыроўкі, выкананыя Аленай Яўневіч.

Але ўсе гэтыя тонкасці бачны хіба дасведчаным дарослым, дзецьмі ж яны ўспрымаюцца на падсвядомасці, фарміруючы іх светапогляды і эстэтычныя густы. Малодшым бліжэй сама аўра добрай казкі і чароўных пераўтварэнняў. Старэйшых прыцягне рамантыка і таямнічасць першага кахання, прычым не толькі Папялушкі (Дар'я Зімніцкая) і Прынца (Сяргей Талкач, ён жа ставіў харэаграфію). Падлеткі могуць атаясамляць сябе з маленькім Пажам (Ганна Сцепанец, яна ж — адна з сёстраў Папялушкі). Паводле спектакля, Паж таксама закаханы ў Папялушку, толькі яшчэ сам гэтага не разумее. Тая ж успрымае яго хіба як лепшага сябра: ну ён жа не прынц на белым кані! Тыповая сітуацыя (і не толькі, дарэчы, у тынейджарскім асяродку) магла б стаць тэмай для абмеркавання ў сямейным коле.

Акцёры і з лялькамі добра спраўляюцца, і жыўцом іграюць выразна, некаторыя — адразу па некалькі роляў, часам супрацьлеглых: і Мачаху і Хросную-Фею ўвасабляе Марыя Кавалёва. А калі спектаклем захоплены самі ўдзельнікі, дык ці могуць застацца абыякавымі гледачы?..

Фота прадастаўлены тэатрам

К

Практыкі асэнсавання Багдановіча

Куратар — Аляксей Барысёнак, архітэктар — Наталля Гарачая, дызайнер — Сяргей Шабохін... Калектыў з 14 мастакоў, каманда аўтараў тэкстаў... У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча праходзіць выстаўка пад назвай "Усё, што цвёрдае, растае ў паветры". Гэты праект, рэалізаваны ў рамках конкурсу "Арт-сац-лаб", звяртае на сябе ўвагу па многіх параметрах. Ад канцэпцыі — да яе ўвасаблення: перад намі, бадай, адна з самых яскравых выставак сучаснага мастацтва за апошні год.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

І ў цэнтры яе — фігура Багдановіча, ці, дакладней, дыскурс паэта, які развіў канон рамантычнай паэзіі ў беларускай літаратуры. Перанясі выстаўку ў іншае месца, і яна згубіць сваё сэрца. Тут можна толькі ўхваліць адкрытасць культурнай інстытуцыі за тое, што ў перыяд рэканструкцыі яна рашылася на падобнага кшталту "інтэрвенцыю". Не варта бачыць у творах мастакоў развянчанне асобы паэта і публіцыста, бо гэта іх развагі над тым, як трансфармаваліся ў сучасным грамадстве ідэі рамантызму, апетыя беларускім класікам.

"Адзінота, сімвалічнасць прыроды і гарадской прасторы, рамантычныя адносіны з жанчынай, любоў да Радзімы ..." — асноўныя "маякі" паэзіі Максіма Багдановіча. У мастацкіх работах яны "мігцяць" новымі сэнсамі. Дык што значыць быць лірычным героем-адзіночкай у часы, калі, як вядома, "аўтар памёр"? Як эксплуатуюцца рамантычныя стасункі ў сучаснай культуры спажывання? Дзе сёння палягае мяжа паміж прыватным і публічным? Як яна рэгламентуецца? "Рэвізіі" падвяргаецца не толькі сам музей, як месца захавання і канструявання памяці аб беларускім класіку — а ўстанова, дарэчы, перажывае не лепшыя часы, — але і ідэалы рамантызму XIX стагоддзя. Яны ў XXI веку атрымліваюць зусім іншыя кантэкст і ўвасабленне.

Рамантыка і радзіма

Да прыкладу, Аляксей Навумчык і Антон Сарокін у сваёй рабоце "Love stock" выкрываюць стэрэатыпы масавага густу ў візуалізацыі вобраза закаханых. У лічбавым банку фотавыяў мастакі набылі фатаграфію, якая ўтрымлівае ўсе неабходныя для падобнай карцінкі маркеры — маладая пара, гарадскі пейзаж, закаханыя, добрае надвор'е... На абстракным мосце ў гарадскім атачэнні абстрактная пара мілуецца ў перадвячэрні час — так выглядае тая бесклапотная выява. Але яе ўжыванне дакладна рэгламентуецца адмысловай дамовай на выкарыстанне файла, якую заключылі мастакі. Дык якім жа чынам файл ператвараецца ў прадукт, а каханне — у тавар? Вось гэты, прыведзены ў экспазіцыі дакумент, бадай, саркастычны прыклад таго, як эканамічныя варункі рэгламентуюць рамантычныя адносіны, а каханне — далёка не такое нейтральнае паняцце, як часам мы прызвычаіліся меркаваць.

Ці яшчэ адзін цікавы прыклад.

Алена Гайдук і яе работа "Без назвы", што дасылае да такога галоўнага "маяка" творчасці Багдановіча як тэма радзімы. Месца, цалкам канкрэтнае і адчувальнае, асмелюся сказаць, што для паэта радзіма была і краем далёкім, запаветным, нястачу якой ён адчуваў увесь час. Інсталяцыя ўмоўнага памежнага слупа і "міфічнай зорнай мапы", што ўяўляе з сябе нішто іншае як дыяграму міграцыйных плыняў у Рэспубліку Беларусь і з яе — выдатная нагода паразважаць над тым, што сёння ёсць радзіма ў сучасным глабальным свеце. Ці вымяраецца гэтае паняцце рамкамі тэрыторыі? Што ёсць выхадам за яе межы? І дзе палягаюць нашы ўнутраныя межы, якія прымушаюць нас утрымлівацца ў межах знешніх? Гэтыя пытанні — адны з нямногіх, што правакуе, здаецца, даволі простая работа Алены, якая ўтрымлівае складаную метафару "зорнага неба", зрухаў у людской свядомасці і іх вынікаў.

У экспазіцыйнай прасторы. / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Антаніна Слабодчыкава. "Героі ўсяго толькі героі".

Сяргей Шабохін. "ST()RE".

Гісторыя і сучаснасць

Безумоўным сэнсавым "цвіком" выстаўкі сталася інсталяцыя Сяргея Шабохіна "ST()RE", у якой мастак працуе з непасрэдным "месцам дзеяння" — музеем. У цэнтры яе — элементы былой экспазіцыі, зробленай мастаком-афарміцелем Эдуардам Агуновічам. Пліты мармуру, якія так і не былі скарыстаны для запланаванай, але не зробленай залы, ажурныя рашоткі для вокнаў, архіўныя аб'екты, выразкі з газет, "хворыя" кнігі Максіма Багдановіча — усё гэта знайшло "вечны спакой" у цэнтры залы ў форме вялізнай пліты, дасылаючы да розных канатацый. Але, "... гіганцкія макі на магілках даюць самы лепшы опіўм" — узнаўляе цытату Джэймса Джойса Сяргей Шабохін; і гэта — яшчэ адзін ключ-метафара "прарастання новых сэнсаў", які супрацьстаіць забыццю і абыякавасці.

Цікава, што элементы архітэктурнага аздаблення, якія варта чытаць і як знак эпохі, становяцца прасторай для выказвання яшчэ адной мастачкі — Вольгі Сасноўскай. Вялізныя палотны з ляпнінай і з нанесенымі на іх цытатамі з вядомых твораў класіка, мастачка выкарыстоўвае як "экраны" для відэа. Вольга гэтаксама працуе і са зместам цытуемых твораў — вершам "Пагоня" і паэмай "Страцім-лебедзь" — дакладней, з абліччамі мужчынскага і жаночага, пазначанага ў іх. Што стаіць за гэтымі пазіцыямі, якія ў сучасным грамадстве спрашчаюцца да "прыгожай" (жанчыны) і "моцнага" (мужчыны)? Якія іх візуальныя аблічы дамінуюць у сучаснай культуры? Двухканальная інсталяцыя Вольгі ператварае прастору залы ў "поле бітвы", дзе медыйныя выявы выкрываюць адна адну і праяўляць актыўны працэс абязлічвання фігур, якія страцілі глебу паэтычнасці, паўнавартасці і рэальнасці.

Каханне і капітал

Абавязковы "хіт" выстаўкі — відэа "КаханнеЗолата" калектыву мастачак Бюро Меладраматычных Даследаванняў з Румыніі — яшчэ адзін яскравы прыклад працы з ідэаламі рамантызму. У фармаце дасціпнага кулінарнага шоу, цытуючы адначасова Мадонну і Спінозу, дзяўчаты літаральна "на пальцах" паказваюць механізм "пранікнення капіталу ў сферу пачуццёвага". Праводзячы паралель паміж каханнем і золатам, што сёння "пераплавіліся" ў адну субстанцыю, атаясамліваючы пасляховасць сучасніка, Ірына Георге і Аліна Попа прапануюць публіцы паставіцца да рамантычных пачуццяў з пэўнай доляй... спакою. Не як да "адухоўленага тавару", якімі яны сталі ў капіталістычным грамадстве, а як да "абдымкаў нечаканага", што нясе ў сабе значна больш магчымасцяў. Адмовіцца ад гатовых рэцэптаў — вось выйсце, што мусіць "разбіць" оптыку матэрыяльнай скіраванасці сучаснага грамадства. І гэты выснова дае сапраўдны спадзеў на ўласны шлях і здаровае пачуццё цвярозасці ў сучасных варунках.

Але ж вернемся да беларускага класіка. Мяркую, што гэта самае выслоўе пра адмаўленне гатовых рэцэптаў, выдатна пасуе да самой выстаўкі, якая ўвасобіла крытычны і дасціпны падыход да звыклых рэчаў і атачэння. Адзінае, што можна далучыць да ейных недахопаў — гэта тая тэарэтычная нагрувашчанасць, якая патрабуе ад сярэдняга наведвальніка пэўных высілкаў, каб дабрацца да сутнасці.

З іншага боку, а чаму паняцце капіталу і біяпалітыкі павінна быць закрытым для таго самага сучасніка? І, перафразуючы назву выстаўкі "Усё, што цвёрдае, растае ў паветры" (яна, нагадаю, з'яўляецца цытатай з "Маніфеста камуністычнай партыі" К.Маркса і Ф.Энгельса), магу дазволіць сабе такую выснову: а чаму, сапраўды, усё, што з'яўляецца складаным, мусіць быць спрошчана?

Ёсць і такія практыкі асэнсавання Багдановіча — і гэта выдатна.

К

фотафакт

"...Віцебск" — Віцебску

Сёння ў Віцебскім мастацкім музеі Уладзімір Пракапцоў падараваў гораду сваю карціну "Мой Віцебск". Імпрэза адбылася з нагоды 40-годдзя заканчэння ім мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (зараз ВДУ імя П.Машэрава). Уладзімір Іванавіч застаўся адданым магіі лічбаў: прэзентацыя пачалася ў дзень яго народзінаў 08.08 а 8-й гадзіне раніцы.

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком: Смаргонь

Цюнінг для “хаткі

Калі адкрыць Вікіпедыю, дык пра паходжанне назвы горада Смаргонь можна даведацца шмат цікавага. Мне бліжэй версія, згодна з якой у даўніну частка мясцовых жыхароў называлася “смарагоны” (“смургоні”), гэта значыць тыя, што гналі дзёгаць з выкарчаваных пры распрацоўцы участкаў пнёў. Да дзёгцю я стаўлюся з велізарным піетэтам, але большае захапленне выклікаюць абаранкі. З гарбатай я магу іх спажыць да 20 штук за раз — у залежнасці ад памеру. У прынцыпе, на радзіму абаранкаў, якой лічыцца Смаргонь, я і накіраваўся перш за ўсё з-за таго, каб у гэтым сакральным для ўсіх аматараў названага далікатэсу месцы аддаць належнае смакавым якасцям прадукту. Жарт. Галоўная прычына была ў тым, каб уварвацца ў святая святых шэрагу ўстаноў культуры горада разам з вядомым чалавекам, які тут нарадзіўся. Як звычайна, у рамках нашай рубрыкі мы планавалі прайсціся настальгіяй па некалькіх установах, якія наш герой наведваў у сваім дзяцінстве/юнацтве....

Уладзімір Церабун ля ўваходу ў Мемарыяльны комплекс.

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Смаргонь — Мінск / Фота аўтара

Музыка — для душы

На жаль, у Смаргоні амаль не засталося ўстаноў культуры, у якія Уладзімір ЦЕРАБУН — скульптар, член Беларускага саюза мастакоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь — хадзіў школьнікам. Дакладней, будынкі нікуды не дзеліся, але профіль устаноў памяняўся (напрыклад, у старым будынку Дома культуры, дзе прайшлі самыя слаўныя школьныя гады Уладзіміра Васільевіча — мастацкая самадзейнасць, танцавальныя вечары, знаёмствы,— знаходзіцца... каталіцкі моладзёжны цэнтр).

Па ўспамінах Церабуна, культурнае жыццё ў Смаргоні ў гады яго маленства біла ключом у асноўным у Доме культуры і Доме піянераў. У пасляваеннага пакалення была пякучая патрэба да самавыяўлення ў самых розных галінах, уключаючы мастацтва. У яго музычнай частцы адным з лідараў для падлеткаў горада стаў у канцы 50-х-пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя Аляксандр Дзяруга (тую яго дзейнасць сёння аднеслі б да культуралогіі; яму — па ініцыятыве Уладзіміра Васільевіча — у 2007-ым у Смаргоні была ўсталявана мемарыяльная дошка), які набраў у ДК таленавітую моладзь з дзвюх школ у танцавальны ансамбль, народны і цымбальны аркестры, іншыя калектывы. Церабун і цяпер любіць нешта зымправізаваць на некаторых музычных інструментах. Вядома, усё гэта на аматарскім узроўні, але для душы. Перавагу аддае гітары, рускаму рамансу, відаць, уплыў узросту. І не без падстаў лічыць сябе канструктарам, хто ў тых жа 60-х ўдасканаліў цымбалы, прыдумаўшы да іх металічныя ножкі, а Барысаўская фабрыка музычных інструментаў узяла навінку да вытворчасці. (Аб існаванні патэнтазнаўства хлапчук у той час не падазраваў.) Але музыку ён разглядаў для сябе як захапленне, а сэрца яго заўсёды належала выяўленчаму мастацтву.

— Я ўжо тады займаўся разьбой па дрэве: адна з работ тых гадоў “Цымбалістка” да гэтага часу, на маю думку, знаходзіцца ў Музеі народнай творчасці ў Гродне, — кажа Церабун. — Вучыўся я гэтаму рамяству самастойна, бо ў Смаргоні адпаведных навучальных устаноў не было. Бацька мой працаваў на лесазаводзе і прывозіў дадому драўляныя абрэзкі. Яны былі такія прыгожыя, роўненькія, гладкія, што самі прасіліся, каб з іх што-небудзь выразаць. Тэмы браў з перакідных календароў, на старонках якіх можна было ўбачыць скульптурныя выявы. Так і ўзнікла ў мяне любоў да гэтага мастацтва. У Доме піянераў быў гурток, дзе займаліся малюнкам па клетачках, але мне гэта было не цікава, а ў школе настаўнік працы даў мне першыя асновы вырабу формаў з гіпсу. Некалькі ўрокаў вырабу каркасаў, лепкі я атрымаў у самадзейнага майстра Аляксандра Жываева.

Вось так, набіраючыся ведаў і набіваючы руку, адслужыўшы ў войску, будучы мэтр айчыннай скульптуры апынуўся ў 1968 годзе ў Мінску і пасля месяца вучобы на падрыхтоўчых курсах паступіў на аддзяленне скульптуры сталічнага Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Скончыўшы яго на год датэрмінова і з адзнакай, ён атабарыўся ў Гродне, а ў 2001-м, будучы ўжо прызнаным майстрам, пераехаў у Мінск.

Калі няма таго ДК, тады пойдзем у музей

— У Смаргоні мая першая персанальная выстаўка адбылася ў год майго 40-годдзя, у 1986-м, у гісторыка-краязнаўчым музеі: тады ён знаходзіўся ў былым касцёле Святога Міхаіла Архангела, — распавядае Уладзімір Васільевіч. — Потым ужо ў новым будынку музея прайшлі яшчэ тры мае выставы (апошняя ў гэтым годзе, сумесная з іншымі скульптарамі рэспублікі).

— Чым цяпер прыцягваеце публіку? — пытаюся я навуковага супрацоўніка ГКМ Вольгу САМАРКІНУ.

— Выстаўкай беларускіх мастакоў “Мелодыі Радзімы”, а за год у нас праходзіць каля дзясятка зменных выставак. Карыстаюцца попытам камерцыйныя, матылькоў, напрыклад. З адносна апошніх выклікала цікавасць калекцыя прадметаў хатняга інтэр’еру сярэдзіны мінулага стагоддзя. Рэзананс мела экспазіцыя, прысвечаная Першай сусветнай вайне. Яна магла б заявіць пра сябе гучней, калі б мы здолелі выкарыстаць пры гэтым сучасныя тэхналогіі ды адпаведнае абсталяванне.

На гэтай тэме мы з Вольгай Іванаўнай спыніліся больш падрабязна, успамінаючы, дзе тэхналогіі сёння ўкараняюцца ў музейнай справе з не абы-якой аддачай...

— Мы ў гэтым плане выглядаем слаба з той прычыны, што з сярэдзіны 2000-х гадоў музей даафармляўся мала, — прызнаецца Вольга. — Ён выглядае як класічная ўстанова ў яе звычайным уяўленні. Толькі пазайздросціць можам, напрыклад, мінскаму музею Янкі Купалы з яго інтэрактывам. Ці ўплывае тое, што мы пакуль не ідзём у нагу з часам, на наведвальнасць? Напэўна, так. На жаль, наша ўстанова не такая папулярная ў мясцовых жыхароў, у моладзі ў першую чаргу. Былыя школьнікі рэдка зазіраюць да нас пасля таго, як іх прыводзілі сюды на экскурсіі настаўнікі. Мы, вядома, рэкламуем свае мерапрыемствы, але, як правіла, поўнымі залы бываюць толькі ў першыя дні новых выставак. Праводзім у тых жа школах выязныя дэманстрацыі нашых фондаў, распрацоўваем лекцыі, у сябе арганізуем музейныя заняткі… Але, зноў жа, як захаваць гэтую цікавасць да сваёй спадчыны ў дарослага насельніцтва?

Я пачынаю ўслых разважаць пра тое, а ці не прыдумала наша грамадства ўсё ўзрастаючую цікавасць да мінулага краіны, да яе гісторыі, мовы, традыцый, этнікі, пра якія паведамляюць СМІ? Ну, калі, дапусцім, немалая частка музеяў пустуе? Падрыхтаваўся атрымаць адпор, але дзіўлюся, што і спадарыня Самаркіна часам задае сабе тое ж пытанне. Вольга Іванаўна наракае на тое, што пра такія нацыяўтваральныя рэчы людзі з-за занятасці уласным побытам успамінаюць нячаста. А Уладзімір Васільевіч перакананы, што вінаваты ў тым ўплыў (хай і апасродкаваны) тых, хто, жывучы на гэтай зямлі, на генным, каранёвым, духоўным узроўні не мае з ёй сувязі. Што адукацыя не з’яўляецца духоўным апірышчам для маладога чалавека і яшчэ вельмі вялікі ўплыў (розны) на чалавека аказаў Інтэрнэт. “Што тычыцца беларускай мовы, — кажа ён, — дык у школе ёй таксама мала ўвагі надаецца, а пачынаць трэба з дзіцячага саду. Англійская — неабходнасць. З беларускай мовай будзе тое ж самае, але трэба час. І тады гэта будзе брэнд нацыі”.

— Унутранаму памяшканню музея, асобным яго кампанентам патрабуецца пераробка, хоць бы частковая, — працягвае дзяліцца надзённым Самаркіна. — Значыць, патрэбен праект, праекціроўшчык, такім чынам — грошы. Або возьмем іншы аспект. У горадзе ёсць калекцыянеры, якія гатовы падзяліцца нейкім антыкварыятам, звязаным, скажам, з той жа Першай сусветнай (насамрэч у нас не так шмат артэфактаў, якія маюць да яе дачыненне). Вядома, зноў патрэбны грошы. Дзяржава, як можа, выконвае свае фінансавыя абавязацельствы перад намі, але на ўсё не хапае. Таму шукаем спонсараў.

Мара вялікая і малая

Школьнікам Уладзімір Васільевіч таксама займаўся пошукамі, наведваючы Смаргонскую раённую бібліятэку ў надзеі знайсці ў ёй кнігі, якія яго цікавілі, — канкрэтна па выяўленчым мастацтве і культуры:

— А Жуль Верн мяне не прыцягваў, гэта ўжо гадоў 20 таму я прыйшоў да літаратуры наогул — да энцыклапедычнай, мастацкай. Ды і тыя сябры мае асабліва не чыталі, бацькі — людзі, што называецца, ад зямлі. Мама ў апошнія гады чытала Біблію, Евангелле. Магчыма, што савецкі народ сапраўды быў самым чытаючым у свеце, але чым больш ён аддаляўся ад інтэлігенцыі, ад вялікіх гарадоў, тым меншай станавілася цяга да чытання, трэба было ад відна да відна працаваць у полі.

І сёння ў “раёнку” Церабун заходзіць. Ёсць падстава. Нядаўна ён выдаў свой альбом “На хвалях часу”. Штосьці падорана, штосьці набыла бібліятэчная сістэма. Бібліятэк на Смаргоншчыне 20, і яны налічва-

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Іўе — Мінск /
Пра будучы Кодэкс

Днямі па ініцыятыве намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Наталлі Кучынскай ў Палаце прадстаўнікоў праведзена інфармацыйная сустрэча для спецыялістаў аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Іўеўскага райвыканкама і работнікаў Іўеўскай раённай бібліятэкі.

Пачалася сустрэча з інфармацыйнай гадзіны, у якой прынялі ўдзел начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народных промыслаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Задзяркоўская, саветнікі-кансультанты аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Павел Бірукоў і Людміла Сарока. Наталля Кучынская, якая наведала наш раён і пасля запрасіла да сябе, распавяла пра работу над падрыхтоўкай праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. У дыялогу аб развіцці бібліятэчнай справы былі акрэслены праблемныя пытанні рэалізацыі заканадаўства ў бібліятэчнай справе, аптымізацыі сеткі ўстаноў, камплектавання фондаў.

Затым госці з Іўеўшчыны наведалі з экскурсіяй авальную залу і Музей гісторыі развіцця беларускага парламентарызму. Прэс-сакратар пазнаёміў прысутных з гісторыяй парламентарызму ў Беларусі. Вялікую цікавасць выклікалі экспанаты, якія прадстаўлены ў музеі. Гэта першыя фатаграфіі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і членаў Савета Рэспублікі Беларусь, розныя атрыбуты (мікрафон, тэлефон, пласцінка з запісам гімна) і інш. Важнае месца ў экспазіцыі займаюць пратакольныя падарункі Прэзідэнту ад дэлегацый з іншых краін.

Работа была працягнута ў Прэзідэнцкай бібліятэцы. Пасля прагляду фільма пра гісторыю бібліятэкі, была праведзена экскурсія па Музеі гісторыі бібліятэкі. Яе дырэктар Сяргей Квачан прадставіў практычную дзейнасць спецыялістаў па стварэнні электроннага фонду бібліятэкі, па інфармаванні карыстальнікаў і забеспячэнні іх навінкамі спецыяльнай літаратуры. Асаблівую цікавасць выклікала ў гасцей работа аддзела старадрукаваных і рэдкіх кніг. Падводзячы вынікі сустрэчы, Наталля Кучынская падзякавала Іўеўскім спецыялістам за актыўную грамадзянскую і прафесійную пазіцыю, запрасіла да актыўнага абмеркавання нормаў праекта Кодэкса аб культуры.

Эдзіта КАЗАЧЭНКА,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу

У Прэзідэнцкай бібліятэцы.

Гродна /
Сябруем з усімі

У 2011 годзе супрацоўнікі аддзелаў абслугоўвання Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага сталі на Гродзеншчыне першапраходцамі ў правядзенні выязных дзён інфармацыі на прадпрыемствах і ў арганізацыях Гродна.

Работнікі гэтых устаноў, аднойчы скарыстаўшыся паслугамі бібліятэкі, ацанілі на практыцы выгаду і аператыўнасць новага сэрвісу. Кіраўнікі

Падчас кніжнай выстаўкі ў Гродне.

Юрый Жэрко (другі злева) з ацёрамі "Майстэрні ўраджанняў".

Вольга Самаркіна ў зале ГКМ, прысвечанай Першай сусветнай вайне.

Святлана Афанасьева.

Напалеона", або Куды падзеўся эксклюзіўны абаранак?

юць каля 30 тысяч карыстальнікаў. 4000 — у СРБ, сярэдняе штодзённае наведванне яе дасягае 150 чалавек, большая іх частка — людзі перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Зразумела, што найбольшым попытам карыстаецца топавае чытво. (У бібліятэцы існуе такая платная паслуга, калі, карыстаючыся так званым камерцыйным фондам, усё суперпапулярнае можна прачытаць, апярэдзіўшы ўсіх. Дарэчы, іншыя пазабюджэтныя даходы тут фармуюцца за кошт сродкаў, атрыманых за выкарыстанне ксеракса, камп'ютара, магчымасць узяць на дом перыёдыку, ды іншых).

Сучасная беларуская літаратура (і на беларускай мове, само сабой) таксама не адстае ад "палп фікшн", сцвярджае дырэктар установы Святлана АФАНАСЬЕВА. Напрыклад, такіх аўтараў, як Валянціна Паліканіна, Міхаіл Пазнякоў, Уладзімір Ягоўдзік, Валерый Квілорыя. Праўда, не любы наш пісьменнік, якім сябе хтосьці лічыць, можа быць закуплены "публічкамі". У прыярытэце тое, што выпускаецца дзяржаўнымі выдавецтвамі, творы членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. У СРБ, між іншым, рэгулярна праходзяць сустрэчы чытачоў з айчыннымі празаікамі і паэтамі.

— Ладзім і выезды бібліятэкі, — распавядае Святлана Мікалаеўна. — Адзін з апошніх быў 3 ліпеня, калі ўпершыню на адкрытай пляцоўцы размясцілася наша чытальная зала. Людзі чыталі кнігі на свежым паветры, маглі запісацца ў бібліятэку (у выніку такіх аказалася 40 чалавек). А яшчэ мы наладзілі нешта накшталт буккросінгу.

Нібы пачуўшы слова "буккросінг", нечакана ў нашу гутарку ўмешваецца наведвальнік: жанчына прапануе кнігі (бясплатна) са сваёй сямейнай бібліятэкі, якія ні ёй, ні яе хатнім ўжо не патрэбныя. "Прыносьце", — адказвае дырэктар.

— І шмат аналагічных прапаноў вам паступае? — цікаўлюся я.

— Раз у тыдзень дык дакладна, — ківае Святлана Афанасьева. — Але адбіраем не ўсё. Здараецца, прыносяць кнігі, якія толькі што былі папулярныя і якія па-ранейшаму запатрабаваныя. Бярэм нешта вядомае: з таго, што на стагоддзі. Кнігі па школьнай праграме — яны ў нас пастаянна на руках, таму "лішнія" не перашкодзяць. Трапляюцца рэдкія асобнікі, як гэты…

Спадарыня Афанасьева дастае з паліцы мініяцюрную кніжыцу з вершамі Гумілёва.

Да праблем у сваёй працы дырэктар адносіць тое, што з-за абмежаванасці ў сродках зараз бібліятэкі раёна могуць дазволіць сабе набыць акрамя абавязковай толькі самую запатрабаваную ў публікі літаратуру ("Кшталту Данцовай?" — "Не, апошнія яе кнігі не можам: яны і ў кнігарнях дэфіцытныя"). Ёсць у кіраўніка гэтай установы культуры і дзве мары. Першая. У бібліятэцы няма... "санітарнага пакоя" (так карэктна Святлана Мікалаеўна пайменавала памяшканне, у якім, у прыватнасці, мыюць рукі). Другая: патрэбны новы будынак — вялікі, камфортны. І з наваротамі. Грошай пакуль няма ні на мінімум, ні на максімум.

Не ўсё вельмі проста

Знаходзячыся ў Смаргоні, мы не маглі не наведаць Мемарыяльны комплекс па лініі супрацьстаяння ў Першай сусветнай вайне, у з'яўленні якога герой гэтага матэрыялу прымаў самы непасрэдны ўдзел і лічыць адным з галоўных творчых праектаў у сваім жыцці. Менавіта на месцы парку Перамогі з верасня 1915-га па люты 1918 года праходзіла мяжа руска-германскага фронту. Страшэнныя баі забралі каля 70 тысяч жыццяў. У гонар герояў ды ахвяр той вайны і быў узведзены мемарыял. Уладзімір Церабун распавёў, што ідэолагам яго з'яўляецца даследчык Уладзімір Лігута, які аднойчы прапанаваў такім чынам увекавечыць памяць загінулых. У 2006 годзе Смаргонскі райвыканкам абвясціў конкурс праектаў, перамог у якім аўтарскі калектыў пад кіраўніцтвам скульптара, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Анатоля Арцімовіча. Ён і запрасіў Церабуна увайсці ў сваю творчую групу, на што апошні пагадзіўся і стаў актыўным будаўніком і скульптарам ў адной асобе.

Меркавалася, што ў праект ўвойдуць яшчэ два яго складнікі. На тэрыторыі горада павінны былі з'явіцца 9 знакаў: камяні з памятнымі тэкстамі. А каля вёскі Ходакі, блізу трасы Мінск — Вільнюс, — скульптурная кампазіцыя "Праклён вайне". Пляцоўку ў парку Перамогі будаўнікі пачалі расчышчаць ў 2012 годзе. У 2014-м частка мемарыяла была гатова і ўрачыста прэзентавана, аднак з канца жніўня таго ж года працы прыпыніліся: патрабавалася іх дафінансаванне. Але як ужо паабяцаў Сяргей Нарышкін — старшыня Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, старшыня Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы, — у 2016-м пытанне аб неабходных сродках будзе вырашацца, каб завяршыць будаўніцтва комплексу да канца 2018 года — да 100-годдзя заканчэння Першай сусветнай вайны.

15 верасня гэтага года ў Смаргоні пройдзе мітынг-рэквіем, прысвечаны пачатку абароны горада ў Першую сусветную. У ім возьме ўдзел і расійская дэлегацыя. "Наша задача яшчэ раз сказаць пра тую вялікую трагедыю, якая абрынулася на беларускую зямлю 100 гадоў таму, і наш святы абавязак — памятаць пра гэта", — кажа Церабун.

І пра Напалеона таксама

Падарожнічаючы па Смаргоні, мы абмяняліся з Уладзімірам Васільевічам парай ідэй, якія, як нам здалося, маглі б зрабіць горад яшчэ больш прывабным для турыстаў. Я абмежаваўся той, якая ляжыць на паверхні: правядзенне штогадовага міжнароднага фестывалю абаранкаў. А для пачатку можна было б адкрыць у Смаргоні фірменную краму, якая гандлявала б гэтым ласункам. Церабун жа хоча схіліць горад да містыфікацыі сапраўды сусветнага ўзроўню. Як вядома з гісторыі, 5 снежня 1812 года менавіта з гэтага горада збег у Парыж Напалеон, кінуўшы на волю лёсу рэшткі ўласнага войска і прыгаворваючы: "Ад вялікага да смешнага — толькі адзін крок..." Скульптар прапануе адшукаць дзе-небудзь на ўскраіне старажытную хатку, "адцюнінгаваць" яе ў духу сялянскіх халуп XIX стагоддзя, напоўніць прыдатным начыннем (як варыянт — муляжамі) і... І выдаваць хату за апошнюю мясціну знаходжання Банапарта на беларускай зямлі (гістарычныя ж байкі абвяшчаюць, што імператар у мітусні пакінуў у мясцовай карчме сваю славутую трохвуголку, дык няхай "мемарыяльнай" будзе не карчма, а хацінка)! Увогуле, гораду думаць і вырашаць, ці годныя нашы думкі для рэалізацыі на справе, бо выдаткі невялікія (?), а рэха — ого-го якое!

У наступным годзе Уладзіміру Васільевічу споўніцца 70. "Ніякіх выставак больш не будзе, — сказаў скульптар, — іх ужо прайшло 17, дастаткова, а вось запрасіць сяброў на вечар раманса — на такі нечаканы і прыемны — можна". А бліжэйшай важнай падзеяй у асабістым жыцці Церабуна стане яго пераезд... у Смаргонь — на пастаяннае месца жыхарства:

— У такога рашэння некалькі прычын. Ужо не надта шмат здароўя ў мяне, каб матляцца туды-сюды. Другая: займацца манументальным мастацтвам сёння — справа цяжкая і вельмі адказная. Трэцяя звязаная з эканомікай — мала заказаў у нашай прафесіі. А тыя, што здараюцца, трапляюць пераважна да "сваіх". Жывучы ў сталіцы, я наўрад ці атрымаю нейкую прапанову, а трэба плаціць за майстэрню, інтэрнат. А вось давесці мемарыял да канца — гэта мой абавязак, я ж стаяў ля яго вытокаў, а кожную пачатую справу трэба даводзіць да канца.

...Эксклюзіўных абаранкаў я так і не купіў. Вядома, у горадзе яны ёсць, і, калі б у мяне было больш часу, абавязкова б іх знайшоў і ацаніў па вартасці, а купляць немясцовай вытворчасці не стаў, але Уладзімір Васільевіч паабяцаў мне прывезці "родныя"...

К

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

прадпрыемстваў таксама з задавальненнем выбіраюць літаратуру, знаёмяцца з навінкамі, прапануюць яе сваім падначаленым.

Як паказаў час, такія мерапрыемствы сталі запатрабаванымі, і 12 буйнейшых прадпрыемстваў горада, сярод якіх — ААТ "Радыёхваля", ААТ "Малочны свет", ААТ "Гранітэкс", ААТ "Гродзенскі мясакамбінат", ААТ "БелТАПАЗ", РУП "Гроднахлебпрам", СП ТАА "Дынама-Програм" і інш., заключаюць дагаворы на інфармацыйнае абслугоўванне на пастаяннай аснове.

Супрацоўніцтва бібліятэкі з працоўнымі калектывамі цягам апошняга года стала набываць тэматычны характар. Напрыклад, былі арганізаваны выстаўкі — "Мама, мамачка, матуля", "Да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне", "Гродна ў гады вайны ў фотаздымках 1941-1945 гг.", "16 ліпеня — Дзень вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" і г.д.

Вялікую цікавасць выклікаюць прагляды літаратуры па гісторыі Гродна з паказам відэаролікаў, якія арганізуюцца сумесна з вядомымі гродзенскімі краязнаўцамі і калекцыянерамі В.Саяпіным і Я.Парулісам.

Акрамя выязных дзён інфармацыі бібліятэка прымае ўдзел у правядзенні адзіных дзён інфармавання. У прыватнасці, былі арганізаваны прагляды літаратуры на тэмы: "Актуальныя пытанні пенсійнага забеспячэння насельніцтва"; "Пра вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенскай вобласці ў 2014 годзе"; "Саюзная дзяржава: праблемы і перспектывы"; "Пра праблемы насілля ў сям'і" (у рамках Рэспубліканскай прафілактычнай акцыі "Дом без насілля"); "Пра меры папярэджання пажараў і іншых надзвычайных сітуацый у Гродзенскай вобласці" і іншыя.

Прыемна адзначыць, што работнікі прадпрыемстваў не толькі чакаюць, калі да іх прыедуць нашы супрацоўнікі, але і самі прыходзяць у бібліятэку. І хочацца спадзявацца, што выязныя дні інфармацыі дапамогуць у фарміраванні культуры чытання насельніцтва, а бібліятэка стане ключавой крыніцай атрымання інфармацыі.

Алена ПАТАПАВА,
Алена СЕМЯНЮК,
бібліятэкары аддзела абанемента Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага

Браслаўшчына /

Свята развіваецца

На Браслаўшчыне — 600 населеных пунктаў, сярод іх ёсць і невялічкая маляўнічая вёска Вусце ля вытокаў Друйкі. Тут ужо трэці год запар ладзяцца "Вусцянскія музычныя вечары". Іх арганізатарамі з'яўляюцца Слабодкаўскі сельскі Савет дэпутатаў і сям'я Жэрко, якія маюць у Вусці дзве аграэкасядзібы — "У Барысавіча" і "Вусце. Лайф".

Увогуле, з мясцовых жыхароў тут жыве не больш за трыццаць чалавек. Але летам, асабліва ў той дзень, калі ладзіцца свята вёскі, сюды прыязджаюць іх дзеці, унукі, знаёмыя і сябры. Днямі так і было.

Пачалося ўрачыстае мерапрыемства з уручэння каравая і сувеніраў. Старшыня Слабодкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Станіслаў Кяпсня аддзячыў сям'і Жэрко за падтрымку ў навядзенні парадку на зямлі, бо менавіта з іх удзелам добраўпарадкаваны бераг возера Недрава.

Сцэнарый свята вёскі можна падзяліць на некалькі частак. Афіцыйная датычылася 70-годдзя Вялікай Перамогі і вызвалення вёскі Вусце ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое адбылося 13 ліпеня 1944 года. Памяць загінулых вяскоўцаў была ўшанавана хвілінай маўчання… Гаворка ішла і пра тое, што сёлета нашаму райцэнтру споўнілася 950 гадоў. Арганізатары свята прадумалі, як адзначыць і гэтую дату. Прафесійная анімацыйная група "Майстэрні ўражанняў" з Мінска паказала "Легенду пра Браслаў".

Асобна хочацца сказаць пра шматлікіх гасцей, якія прысутнічалі на "Вусцянскіх музычных вечарах". Сваімі песнямі радаваў прысутных кампазітар, выканаўца, паэт, музыкант, лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў, дыпламант Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэат прэміі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Аляксей Скрыпнік.

Паэтэса з Мінска Наталля Ганчарова таксама прыехала на свята вёскі са сваімі творчымі падарункамі. Гэта былі яе вершы пра Вялікую Айчынную вайну, новыя лірычныя творы.

Нельга не ўзгадаць і пра вядомую ўсім групу Зюзі Паазерскага. І хоць у нас цяпер лета, Зюзя парадаваў усіх сваімі жартамі, весялосцю і шчырай адкрытасцю душы.

Вясёлы і бадзёры настрой гасцей свята падтрымліваў ансамбль народнай песні Раённага цэнтра культуры "На панадворку".

На "Вусцянскіх музычных вечарах" працавалі гандлёвыя рады. Тут усіх частавалі духмянай юшкай, працаваў Горад рамеснікаў, дзе можна было наведаць майстар-класы па ганчарстве, ткацтве, рабоце з саломкай, вырабе кветак з паперы, дэкупажы…

Словам, сёлета свята вёскі Вусце набыло больш маштабны характар. І правільна сказаў старшыня Слабодкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Станіслаў Кяпсня, калі людзям падабаюцца такія святы, іх трэба абавязкова ладзіць.

Зіна ПАЛУЛЕХ
Фота аўтара

Тактыка культурнага развіцця

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Максіма Горкага выступае цэнтрам інавацый для бібліятэк Цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы Бабруйска, ініцыятарам і арганізатарам многіх праектаў і пачынанняў.

Практыка інавацый

Напрыклад, на яго рахунку — адкрытыя пляцоўкі ў канцэпцыі "бібліятэка — open air", што дазваляюць знайсці агульныя інтарэсы людзям рознага ўзросту, прапануюць альтэрнатыўныя формы баўлення вольнага часу. Інтэрактыўная літаратурна-бібліятэчная пляцоўка "Маладзёжны бібліясвет" была арганізавана ўздоўж тэатральнага сквера падчас правядзення XIII Міжнароднага фестывалю народнай творчасці "Вянок дружбы". Яна стваралася і працавала пры актыўным удзеле валанцёраў, маладых сяброў бібліятэк.

Адкрываў пляцоўку бібліобус з выстаўкай "Маладзёжная book-тусоўка", а фатаграфіі бібліятэчных падзей і карыстальнікаў прыцягвалі ўвагу наведвальнікаў у фотакалажы. Валанцёры сумесна з супрацоўнікамі гарадскіх бібліятэк №16 і №12 прапаноўвалі прыняць удзел у акцыі "Мая Book-сімпатыя".

Удзельнікі літаратурнай гасцёўні "Бабруйскі почырк", арганізаванай пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы, прэзентавалі сваю творчасць, праводзілі чытанні, выконвалі песні пад гітару. Тут жа размяшчаўся стэнд "Тэрыторыя маладых", які ўключае інфармацыю пра маладых аўтараў Бабруйска. Супрацоўнікі гарбібліятэк №7 імя Алі Шагенцукова і №8 імя Ефрасінні Полацкай запрашалі наведаць адкрытую чытальную залу, дзе ладзіўся буккросінг, прысесці з кнігай, ноўтбукам, пазнаёміцца з рэкламна-інфармацыйнай прадукцыяй ЦБС. Тут жа быў арганізаваны кніжны флэшмоб. На кантрасце з сучаснай чытальнай залай была аформлена гістарычная пляцоўка "70 мірных гадоў", дзе супрацоўнікі Гарадской бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна запрашалі занурыцца ў гістарычнае мінулае і апынуцца ў бібліятэках Бабруйска 1945 года. Стварыў атмасферу стол з карункавым абрусам, кнігі 40-х гадоў, унікальныя нумары газет таго часу, паштоўкі, прадметы побыту.

Завяршыў інтэрактыўную літаратурна-бібліятэчную пляцоўку казачны падворак. Маладых бацькоў з дзецьмі сустракалі лялькі-дэкарацыі Прынц і Прынцэса. Касцюміраваныя казачныя героі Чароўная фея і Доктар Айбаліт ад Дзіцячай бібліятэкі №5 імя Надзеі Крупскай прапаноўвалі дзецям і іх бацькам пасядзець і пачытаць на літаратурнай лаўцы кнігі з выстаўкі сямейнага чытання. Валанцёры ж Дзіцячай бібліятэкі №6 імя Мікалая Астроўскага ў вобразе герояў розных казак, а таксама Кніжны Гном і Баба-Яга (Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя Аркадзія Гайдара) падрыхтавалі конкурсную праграму "Казачны калейдаскоп".

Бібліятэчная кінаіндустрыя — адзін з самых цікавых і значных інавацыйных праектаў аддзела. На працягу некалькіх гадоў былі створаны фільмы і ролікі розных жанраў тэматычнага або дакументальнага кіно (прэзентацыйныя фільмы, фільмы-рэпартажы, фільмы-падзеі, стэндавыя альбо рэкламныя фільмы, музычныя кліпы, фільмы патрыятычнай накіраванасці ў рамках інфармацыйна-культурных праектаў "Памяць", "Падарожнічаем з кнігай па родным краі" і г.д.). Кожны год супрацоўнікі ЦБС горада Бабруйска рыхтуюць каля 1000 мерапрыемстваў і 300 бібліятэчных выставак, большая частка з іх праводзіцца з выкарыстаннем відэафільмаў, у тым ліку уласнай генерацыі. Яны існуюць у віртуальнай прасторы: размешчаны на бібліятэчным сайце http://bobruisk-library.by і на адкрытым канале Youtube.

Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь быў падпісаны загад ад 29 чэрвеня 2015 года №79 "Аб выніках XXIII Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". У намінацыі "За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы" дыпломам першай ступені і грашовай прэміяй ў памеры 50 базавых велічынь была ўзнагароджана ЦГБ імя Максіма Горкага Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Бабруйска. На конкурс быў прадстаўлены вопыт работы аддзела бібліятэчнага маркетынгу пад назвай "Бібліятэчная кінаіндустрыя — інавацыйная бібліятэчная тэхналогія".

Вольга СТЭЛЬМАК,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Макіма Горкага ЦБС г. Бабруйска

Вэб-фармат для Памяці

"Памяць палаючых гадоў" — пад такой назвай Нацыянальная бібліятэка Беларусі выклала ў інтэрнэт свае алічбаваныя калекцыі, прысвечаныя 70-годдзю Вялікай Перамогі. Імі напоўніцу могуць скарыстацца як шараговыя наведвальнікі Сеціва, так і работнікі клубаў, бібліятэкары ды музейшчыкі, што займаюцца патрыятычным выхаваннем, краязнаўствам, прапагандай нашай гісторыі.

Юбілейны праект не прэтэндуе на паўнату звестак па заяўленай тэме, але дае магчымасць дакрануцца да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праз тагачасныя кнігі і перыёдыку, лістоўкі і рукапісныя матэрыялы, асабістыя і службовыя паперы, плакаты і насценгазеты, фатаграфіі і песні.

У падмурак праекта пакладзены матэрыялы электроннага дыска "Подпольная и партизанская печать Беларуси" (3-е выд., дапоўн., 2015), створанага Нацыянальнай бібліятэкай сумесна з Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пры гэтым структура новага інтэрнэт-рэсурсу значна пашырана, а змест дапоўнены новай алічбаванай інфармацыяй з фондаў галоўнай кніжніцы краіны.

Алічбоўка і публікацыя ў адкрытым інтэрнэт-рэсурсе дазваляюць зрабіць набыткам шырокай грамадскасці масіў усіх відаў беларускага падпольнага і партызанскага друку, увесці ўсе экзэмпляры ў навуковае абарачэнне. Справа ў тым, што гэтыя выданні яшчэ недасканала вывучаны з-за іх дрэннай захаванасці і раскіданасці па розных сховішчах.

Некаторыя з матэрыялаў, прадстаўленых на электронным рэсурсе: плакат П.Н. Гаўрыленкі "Мы зноў з вамі!" і падзяка за ўдзел у вызваленні Оршы на імя маёра У.М. Лапухіна.

"Прачытай і перадай…"

Першымі падпольнымі выданнямі былі лістоўкі і звароты да суайчыннікаў. У праекце прадстаўлены электронныя копіі 140 лістовак і лістовак-плакатаў, выдадзеных у 1942 — 1944 гадах. Большасць з іх выходзіла пад лозунгам "Смерць нямецкім акупантам! Прачытай і перадай другому".

У работнікаў падпольнага і партызанскага друку было шмат цяжкасцей. Адчуваўся пастаянны дэфіцыт паперы і шрыфту. Спачатку набіралі і друкавалі адну паласу, потым шрыфт разбіралі і набіралі другую. Наборшчыкі суткамі не адыходзілі ад наборных кас. Не было цынкаграфіі. Клішэ самадзейныя друкары саматужна рабілі з сухога дрэва, гумы ці лінолеуму. Шрыфт, фарбу, друкарскі станок зберагалі ашчадней за прадукты харчавання, бо ежай можна было разжыцца, а друкарскія прылады дзе ж знойдзеш.

На акупаваныя беларускія землі было накіравана 167 паходных друкарскіх машын. Акрамя лістовак выпускаліся газеты, баявыя лісткі. Паходныя друкарні месціліся, як правіла, у лясах. Напрыклад, сваю друкарню партызаны Карпілаўкі (купалаўскія Акопы, радзіма Ядвігіна Ш.), маскіравалі так, што яе нават падчас блакады партызанскай зоны ўвесну 1943 года фашысты не змаглі выявіць.

Праект змяшчае электронныя копіі звыш 500 нумароў (каля 100 назваў) газет з інфармацыяй пра Беларусь, выдадзеных у 1941 — 1945 гадах на тэрыторыі краіны і за яе межамі. Аднымі з самых вядомых сталі газета-плакат "Раздавім фашысцкую гадзіну!", рэдактарам якой з 1943 года быў К.Крапіва, і сатырычны лісток "Партызанская дубінка". Аўтарскі калектыў складалі вядомыя беларускія пісьменнікі Я.Колас, Я.Купала, К.Чорны, П.Броўка, П.Глебка, М.Танк, В.Вітка і інш. У падрыхтоўцы нумароў, разам з беларускімі прафесійнымі мастакамі, такімі як М.Гурло, М.Гуціеў, З.Азгур і інш., актыўны ўдзел прымалі маскоўскія і ленінградскія графікі — Кукрыніксы, Л.Брадаты, Б.Яфімаў… Акрамя таго, у кожным партызанскім атрадзе працавалі мастакі-самавукі, сярод іх былі і вельмі таленавітыя, такія як В.Букаты, чыё нядоўгае, але гераічнае жыццё і творчасць непарыўна звязаны з гісторыяй партызанскага друку.

З далоньку дзіцяці

Адметнымі матэрыяламі праекта сталі кішэнныя выданні, невялікія па памеры, каб не абцяжарваць байца. Кніжкі з далоньку дзіцяці ўключаюць малюнкі ды подпісы. Старонкі складаюцца гармонікам. На іх гаворка вядзецца пра тое, як знішчаць ворага штыком і прыкладам, як байцу маскіравацца, каб не быць забітым. Дарэчы, некаторыя з такіх выданняў выходзілі пад рэдакцыяй Янкі Маўра.

У гэткіх жа кішэнных па фармаце "Блакнотах агітатара" друкаваліся паведамленні Саўінфармбюро, даклады П.Панамарэнкі пра партызанскую вайну, загады і ўказы аб узнагароджанні партызан іх камандзіраў, перадавіцы з газеты "Правда", лічбы партызанскага рахунку помсты, каляндар дат вызвалення беларускіх гарадоў, даведкі аб стане прамысловасці і сельскай гаспадаркі, пастанаўленне аб аднаўленні Мінска і г.д. У "Блакноце агітатара-партызана" (1943, № 3 — 4) надрукаваны матэрыялы судовага працэсу аб зверствах фашыстаў. Прыводзяцца ўспаміны многіх сведак, напрыклад, чалавека, які цудам выжыў у машыне-"душагубцы".

Рукапісы, фота і плакаты

У фондзе НББ захоўваюцца і рукапісныя партызанскія матэрыялы. Ствараючы карыкатуры на фашысцкіх захопнікаў, памфлеты і сатырычныя вершы, партызаны станавіліся "народнымі мсціўцамі" не толькі ў бітвах, але і ў творчасці. Пажоўклыя лісты час ператварыў у своеасаблівыя помнікі байцам. Па некаторых даных, у партызанскіх атрадах усяго было створана 3 750 рукапісных газет, часопісаў, насценгазет. На жаль, трывожнае лясное жыццё не спрыяла захаванню партызанскіх выданняў, да нас дайшлі іх лічаныя адзінкі.

Можна "пагартаць" і чырвонаармейскія кніжкі, а таксама азнаёміцца з падзякамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага героям Перамогі за мужнасць, праяўленую ў баях, фарсіраванні рэк, вызваленні беларускіх і замежных гарадоў.

Раздзел "Ваенны фотаальбом" прапаноўвае фатаграфіі некаторых герояў, адзначаных падзякамі. На старых здымках, зробленых фотакарамі з рызыкай для ўласнага жыцця, можна ўбачыць удзельнікаў партызанскага руху і воінаў Савецкай Арміі падчас жорсткіх баёў, у кароткія моманты перадышкі і ў хвіліны доўгачаканай Перамогі. Асобная частка калекцыі адлюстроўвае Мінск напярэдадні вайны, горад, разбураны фашысцкімі захопнікамі, і працэс аднаўлення беларускай сталіцы.

Гаворка ідзе і пра алічбаваныя плакаты 1943 — 1990 гадоў такіх вядомых беларускіх мастакоў, як М.Гуцыеў, Г.Паплаўскі, М.Стома і інш. У плакаце пад назвай "Білі, б'ём і будзем біць!" аўтар узгадаў створаны А. Твардоўскім вобраз простага ў сваім гераізме Васіля Цёркіна. Размясціўшы героя ў цэнтры ліста, мастак намаляваў вакол яго эпізоды партызанскіх баявых аперацый: падрыў чыгункі і мастоў, складоў і цыстэрнаў, нямецкіх гарнізонаў і станцый.

Слова як зброя

Ёсць месца ў праекце і мастацкім творам беларускіх пісьменнікаў, напісаных на ваенную тэму і надрукаваных у 1941 — 1945 гадах. Выданні невялікага фармату, вельмі сціпла аформленыя, яны спрыяюць разуменню вайны як нацыянальнай трагедыі, дазваляюць адчуць атмасферу таго часу. Падборка ўключае паэзію — вершы і паэмы, прозу — апавяданні і аповесці, публіцыстыку — заклікі, звароты, нарысы вядомых беларускіх пісьменнікаў, што працавалі ў той перыяд. Прадстаўлены зборнікі і асобныя творы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Броўкі, П.Глебкі, В.Віткі, А.Куляшова, П.Панчанкі, М.Танка, К.Крапівы, М.Лынькова, К.Чорнага і інш. Большасць кніг надрукавана на "Вялікай зямлі" ў беларускім выдавецтве "Савецкая Беларусь", якое вымушана было пераехаць у тыл…

А раздзел "Песні вайны" прэзентуе 40 музычных твораў. Палова гуказапісаў зроблена ў 1941 — 1945 гадах з характэрнай для таго часу аранжыроўкай, манерай выканання. Другая частка — пасляваенныя песні, у тым ліку створаныя вядомымі беларускімі кампазітарамі і паэтамі, такімі як У.Алоўнікаў, І.Лучанок, Л.Захлеўны, Э.Ханок, А.Вярцінскі, А.Русак, М.Ясень і іншыя.

Для інтэрнэт-праекта распрацаваны асобны сайт (http://old.nlb.by/vov70) і праграмнае забеспячэнне, дзякуючы якому песні можна слухаць адразу са старонкі раздзела, кнігі — чытаць ў зручным вэб-фармаце, кожны з файлаў павялічваецца, подпіс да іх даецца ў акенцы, якое ўсплывае пры навядзенні курсора.

Алена ЯКАВЕНКА,
загадчыца сектара інфармацыйнай падтрымкі інтэрнэт-партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Падтрымка грашыма і... песняй

25 ліпеня ля мястэчка Грудэк, што на Беласточчыне, адбыўся фальклорны фестываль "Сяброўская бяседа", а на наступны дзень — "Культура без межаў" у Сямятычах. Дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у суседнюю краіну быў накіраваны цэлы "творчы дэсант" з Мінска, у склад якога — поруч з вядомымі артыстамі — увайшлі карэспандэнты "К" Юрый Чарнякевіч і Ілья Свірын.

Юрка Астапчук і яго "Прымакі". / Фота Ільі СВІРЫНА

Феерверк пад дробным дажджом

Калі мы ішлі пехатою да лясного амфітэатра ва ўрочышчы Борык, ля нас адна за адной спыняліся машыны. Кіроўцы задавалі аднолькавае пытанне: "Дзе тут "Бяседа"? Пыталіся, трэба адзначыць, па-польску. Яшчэ пару дзесяцігоддзяў таму на тамтэйшых вуліцах часам можна было пачуць і нашу мову, але сёння гэта ўжо амаль нерэальна. Тым не меней, многія жыхары тых мясцін працягваюць лічыць сябе беларусамі. Асноўнымі нацыянальнымі ідэнтыфікатарамі сталі прыналежнасць да Праваслаўнай царквы, а таксама — цікавасць да роднай культуры, якая паспяхова выяўляе сваю канкурэнтаздольнасць прынамсі ў гэтай частцы Еўрасаюза.

Ілья СВІРЫН

На ўзбочыне вышыхтаваліся кіламетровыя шэрагі легкавікоў, а ля вялізнай сцэны, абсталяванай паводле апошняга слова тэхнікі, сабралася не меней за некалькі тысяч чалавек. Пэўна, болей, ніж колькасць усіх жыхароў мястэчка Грудэк — ці, як было раней, Гарадок. Адпаведна, культурны фактар спрацоўвае — дзякуючы актыўнасці беларускай дыяспары.

Глядзіце самі: літаральна за тыдзень да "Бяседы" ў тым самым Борыку адгрымеў маладзёжны рок-фестываль, а праз тыдзень пасля нашага прыезду ў суседнім Міхалове адбыўся яшчэ адзін фэст — "Беларускія фольк-сустрэчы". Уласна, гэта другі аскепак небезвядомай "Прымацкай бяседы", якую ладзіў у тым мястэчку нязменны кіраўнік "Прымакоў" Юрка Астапчук. Але калі праз шэраг абставінаў ён перабраўся ў родны Гарадок, падобных па сваёй ідэі фэстаў стала два (на плошчы прыблізна ў 10 км²!) і паміж імі, напэўна, нават узнікла канкурэнцыя. Па складзе выканаўцаў відавочна выйграе "Сяброўская бяседа".

— Мы рэгулярна даем аншлагавыя канцэрты ў вялікіх прэстыжных залах, але ў лесе пачуваемся яшчэ ўтульней, — дзеліцца ўражаннямі кіраўнік усім вядомай "Бяседы" Леанід Захлеўны. — Тым болей, публіка ўжо нас чакае — мы тут выступаем раз мо ў пяты ці ў шосты. І заўсёды едзем з вялікім задавальненнем — па тую атмасферу яднання душ, якая пануе на гэтым фэсце.

Выступленні знакамітых калектываў чаргаваліся з нумарамі мясцовых артыстаў — прычым нават не "the best" Беласточчыны, а менавіта з тамтэйшых ваколіц. Яны атрымалі ўнікальную магчымасць дэбюту на вялікай сцэне. Рэпертуар часам… трохі здзіўляў — асабліва калі дзяўчаты са сваім адмысловым пранонсам узяліся перапяваць хіт "Тату". Але мінскія "хэдлайнеры" паставіліся да іх досыць спагадліва: "молада-зелена"… А ў цэлым, праграма фэсту прафесіяналам спадабалася.

— Кожны фестываль мае тры галоўныя складнікі, — кажа кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" Вячаслаў Шарапаў. — Гэта насычэнне творчымі сіламі, эканамічны фактар і, вядома, аптымізм ды энтузіязм арганізатараў. Калі тры кампаненты супадаюць, усё атрымліваецца.

Сапраўды, ролю асобы ў дадзеным выпадку цяжка пераацаніць. Адзін просты прыклад. Нягледзячы на бездакорна прадуманую арганізацыю (ані ля кропак харчавання, ані... ля іншых патрэбных выгодаў ніколі не ўзнікалі вялікія чэргі), у васьмігадзінную праграму фэста — а яна, па традыцыі, была распісана літаральна па хвілінах — былі ўнесены нечаканыя карэктывы. Недзе каля апоўначы супрацоўнікі польскага МНС атрымалі папярэджанне аб набліжэнні моцнай навальніцы і "згарнулі" канцэрт. Перасцярога была не марнай — калі мы наступнай раніцай ехалі па Беласточчыне, выдзертых з каранямі дрэваў на вочы патрапілася нямала. Але наш куток стыхія абмінула.

Тым не меней, фэст, здавалася б, быў незваротна скончаны — публіка разышлася па дамах, артысты спакавалі інструменты ды паздымалі строі… І вось, у гэты крытычны момант на цёмную, амаль абясточаную сцэну Юрка Астапчук вывеў свой гурт "Прымакі" — і што было моцы зарадзіў перад апошняй сотняй самых упартых гледачоў ды пад дробным дажджом. Гераічныя высілкі мелі папраўдзе чарадзейны вынік. Пачуўшы музыку, людзі вярталіся, натоўп ля сцэны рос бы на дражджах, дождж неўзабаве прыціхнуў, саступіўшы месца феерверку, а праграма скончылася ў запланаваны час — недзе пасля трэцяй ночы.

Гімн фестывалю, які грымеў са сцэны ажно некалькі разоў, даволі нешматслоўны — "Гэй, "Сяброўская бяседа", гуляць трэба сёння нам!". Затое, па сутнасці. Ён і адлюстроўвае той характар народных фэстаў, які ў нас за савецкім часам быў прыцярушаны рознымі выхаваўчымі функцыямі: маўляў, гуляць трэба не проста так, а з нейкай ідэалагічна правільнай нагоды. Тут жа нават сцэнаграфія нагадвае вясковы бяседны стол, а непасрэдна перад сцэнай смажацца два парсючкі.

Прычым землякі сцякаліся на бяседу не толькі з бліжэйшых паселішчаў, але нават з самога Парыжу. Сярод публікі можна было заўважыць Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Рэспублікі Беларусь у Францыі Паўла Латушку. Апрануты ён быў у джынсы — бо прыбыў не з афіцыйным візітам, а ў свой законны ўік-энд.

— Для мяне гэта не палітыка, не дыпламатыя, гэта чыста чалавечыя адносіны! — патлумачыў карэспандэнту "К" былы міністр культуры нашай краіны. — Прыехаўшы сюды ўпершыню дваццаць гадоў таму, я быў моцна ўражаны тым, як беларусы ў гэтых мясцінах любяць і шануюць сваю культуру. І з тых часоў стараюся сюды вяртацца кожны год. Мне гэты фэст блізкі для сэрца і душы, бо гэта — наша, беларускае!

Мінскія госці сышліся на думцы, што пры ўсім багацці айчыннага фестывальнага меню, дакладнага адпаведніка "Сяброўскай бяседы" ў нас няма. Маецца на ўвазе добрае спалучэнне розных інгрэдыентаў — сур'ёзная арганізацыя, моцны склад удзельнікаў, выдатнае абсталяванне плюс нязмушаная атмасфера народнага open air. Падобна, менавіта гэтыя складнікі здатныя зрабіць настоянную на фальклоры музыку больш папулярнай сярод публікі, выхаванай на зусім іншых рытмах.

— Так, наш выступ не выклікаў бурлівых апладысментаў, але ж са сцэны мы заўсёды ўглядаемся ў вочы публікі, і бачыць у іх адпаведную рэакцыю "Песнярам" куды важней, — кажа Вячаслаў Шарапаў. — Нам не падабаюцца тыя імпрэзы, якія скатваюцца на ўзровень шансона, адвучваючы людзей услухоўвацца ў кожную ноту. А на жаль, такіх у нас становіцца ўсё болей...

К

Урокі "Сяброўскай бяседы"

Пэўна, амаль кожны беларус ведае, што летам жыццё нашых суайчыннікаў па той бок Буга заўсёды бывае насычанае разнастайнымі адметнымі фестывалямі, на якія прыязджаюць турысты не толькі з усёй Польшчы, але і са шматлікіх суседніх краін.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Фестывальныя дзеі ладзіліся у названых населеных пунктах літаральна пад адкрытым небам, а гледачы, сядзячы хто на лаўках, хто проста на траве, віталі шматлікіх выканаўцаў гучнымі апладысментамі. Своеасаблівы творчы дэсант з Беларусі — "Песняры", "Бяседа", "Купалінка", "Белыя росы" — былі сустрэты мясцовымі жыхарамі з асаблівай цеплынёй, бо некаторыя з названых калектываў прыехалі на Падляшша ўжо не ўпершыню...

Пасля "завадных" песень і танцаў ад удзельнікаў шматлікіх фальклорных і сцэнічных калектываў многія прысутныя — і не толькі дзеці ды падлеткі, а і сталыя людзі — пачыналі ўваходзіць у смак фармату "open air" ды выконваць самыя разнастайныя танцавальныя "па" наўпрост перад летняй сцэнай. Прычым бліжэй да вечара ахвочых да танцаў станавілася ўсё больш і больш — бачыў гэта, што называецца, на свае вочы. І тое было цалкам невыпадкова: артысты з Беларусі і Польшчы паказвалі такі высокі клас, выконвалі столькі знакамітых і гарэзных беларускіх і польскіх народных песень, што ногі самі прасіліся ў скокі. Таму гукі музыкі сціхлі ў мястэчку толькі пад самую раніцу…

Да слова, плакаты аб прыездзе на свята гуртоў з Беларусі віселі, сам бачыў, паўсюль як у Гарадку, так і ў Сямятычах. Так што беларусаў на Падляшшы чакалі з нецярплівасцю. Як, дарэчы, і год таму: мне давялося пабываць на падобным фэсце ўжо неаднойчы, таму магу сцвярджаць гэта даволі пераканаўча…

Усё ж падрабязна распавядаць пра фестывалі, што адбыліся на Падляшшы, мабыць, не варта: на гэтых імпрэзах трэба пабываць, іх лепш пабачыць на свае вочы, каб акунуцца ў тую непаўторную атмасферу, якую ствараюць артысты ды арганізатары… Таму спынюся на больш празаічных пытаннях. А менавіта на тым, кім і за якія фінансавыя сродкі арганізуюцца падобныя мерапрыемствы бадай на ўсім абшары Падляшскага ваяводства Польшчы.

З першым пытаннем я разабраўся даволі лёгка: як было пазначана на шматлікіх інфармацыйных улётках, развешаных па ўсім Гарадку, арганізатарамі "Сяброўскай бяседы" з'яўляліся улады мясцовай гміны, гмінны цэнтр культуры ды Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ). Што да Сямятыч, дык там над увасабленнем культурнай дзеі працавалі таксама мясцовыя ўлады ды БГКТ, а яшчэ да іх далучыўся Сямятыцкі консорцыум грамадскіх ініцыятыў. Мяркую, і ва ўсіх астатніх беларускіх фестывалях Беласточчыны арганізатары былі прыкладна тыя ж самыя.

Высветліць другое пытанне — пра фінансавы бок названых імпрэз — было ўжо не так проста: арганізатары, натуральна, былі вельмі заняты надзённымі справамі і зазвычай прасілі патурбаваць іх ужо крыху пазней, пасля завяршэння фестывалю. Але пэўныя каментарыі мне атрымаць усё-ткі ўдалося, прычым ад прадстаўніка нашай краіны.

Як патлумачыў "К" саветнік пасольства Беларусі ў Польшчы, дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі ў Варшаве і адзін з арганізатараў названых фестываляў Эдуард Швайко, імпрэзы ў Гарадку і Сямятычах — найбольш буйныя культурныя акцыі беларускай нацыянальнай меншасці, якія летам ладзяцца на Беласточчыне, таму іхні бюджэт складаецца з самых розных крыніц.

— Па-першае, гэта грантавая падтрымка з боку Міністэрства адміністрацыі і інфарматызацыі Польшчы, якое займаецца апекай нацыянальных меншасцей, — адзначыў суразмоўца. — Па-другое, гэта сродкі з бюджэту мясцовых улад — як самой гарадской гміны, так і Падляшскага ваяводства Польшчы. І, натуральна, гэта сродкі некаторых прыватных спонсараў, звычай таксама мясцовых фірм ды прадпрыемстваў.

Да таго ж, як сказаў Эдуард Швайко, не варта забываць і пра падтрымку падобных імпрэз з боку Беларусі. Напрыклад, усе названыя мною калектывы былі дастаўлены на фестываль з дапамогай Міністэрства культуры нашай краіны, якое забяспечыла артыстаў транспартам. Акрамя таго, беларускія ансамблі выступалі ў Польшчы на бязвыплатнай аснове, што фактычна таксама можна лічыць спонсарскай падтрымкай культурных акцый... І падтрымкай даволі значнай: без нашых калектываў, якія дадавалі шмат пазітыўнай энергетыкі ў агульную атмасферу святочных мерапрыемстваў, яны, скажу шчыра, наўрад ці атрымаліся б такімі маштабнымі і відовішчнымі…

Што ж, як на мой погляд, цалкам зразумелы падыход да атрымання фінансавых сродкаў: як бачна, яны збіраюцца з усіх магчымых крыніц. Але што найбольш мяне зацікавіла ў Польшчы, дык гэта тая карпатлівая праца арганізатараў названых фестываляў, якую яны праводзяць са сваімі шматлікімі прыватнымі спонсарамі.

Напрыклад, шматкроць мне даводзілася чуць са сцэны — у перапынках паміж нумарамі і выхадамі калектываў — словы падзякі мецэнатам імпрэзы. На плакатах і ўлётках, што былі развешаны не толькі каля сцэны, а і паўсюль як у Гарадку, так і ў Сямятычах, абавязкова згадваліся партнёры фестывалю, як, дарэчы, і тыя сродкі масавай інфармацыі, якія былі на яго акрэдытаваныя. Акрамя таго, пад час самой фестывальнай дзеі на вялікім плазменным экране, усталяваным каля сцэны, не толькі ішла трансляцыя ўсіх святочных падзей у рэжыме он-лайн, але і рэклама тых або іншых фірм і прадпрыемстваў, якія паспрыялі ў фінансаванні святочнага мерапрыемства…

Як на мой погляд, усе гэтыя высілкі — досыць пераканаўчае сведчанне таго, што мясцовыя арганізатары пра сваіх прыватных спонсараў дбаюць. І робяць гэта, нягледзячы на падтрымку фестываляў беларускай культуры як з боку дзяржаўных, так і мясцовых улад. Чым не прыклад для пераймання арганізатарам тых фестываляў і імпрэз, якія ладзяцца ўжо на Беларусі?

Мяркую, заахвоціць спонсараў да ўдзелу ў тым або іншым культурным мерапрыемстве можна будзе нашмат лягчэй, калі патэнцыйныя мецэнаты будуць ведаць, што пра іх неаднойчы згадаюць пад час свята і нават у рэкламных улётках… Нашы суайчыннікі ў Польшчы так і робяць, і робяць паспяхова. У якасці доказу скажу, што менавіта дзякуючы дапамозе аднаго са спонсараў "Сяброўскай бяседы", артыстам на фэсце можна было бясплатна пачаставацца і квасам, і смачным бігасам — адной з найлепшых польскіх (і, мабыць, беларускіх?) страў…

Але калі беларусы з суседняй краіны могуць зацікавіць сваіх партнёраў культурнымі імпрэзамі, дык і арганізатары падобных мерапрыемстваў у Беларусі на гэта таксама, як я перакананы, здатны тым больш…

К

Часам здзіўляюцца людзі: "А што, Цітовічу сто гадоў? І на яго даму — мемарыяльная дошка?! Не можа быць! Як жа так? Мы ж з ім у гэтым доме нядаўна чарку кулялі!". Дык сто гадоў яму было яшчэ ў 2010-м. А які сёння год на белым свеце? А пра чарку... Шмат напісана пра Цітовіча як пра музыку, даследчыка-фалькларыста, няўрымслівага вандроўніка — збіральніка аўтэнтычных вясковых песень, як пра арганізатара хораў, — у тым ліку Дзяржаўнага народнага... Што тут магу дадаць да рэцэнзій на выступленні яго калектываў, да навуковых даследаванняў пра яго, да мемуараў блізкіх сяброў і навукоўцаў? Ці, мо, вось толькі хіба —

Генадзь Цітовіч падчас навучання ў Віленскай гімназіі (з альтам трэці злева ўверсе).

...Пра Цітовічава "парцейнае" і ягоны след на столі

7 жніўня — 105-годдзе з дня нараджэння Генадзя Іванавіча Цітовіча

Сталася так, што першым фільмам з маім прозвішчам у цітрах як рэжысёра была стужка "Песни славы боевой" (1963 год, Ансамбль песни и пляски КБВО): я зманціраваў канцэрт замест захварэлага калегі. Калі праз пару год у "Тэлефільме" паўстала пытанне: хто будзе здымаць планавы вялікі фільм-канцэрт Дзяржаўнага народнага хора БССР, то рашэнне кіраўніцтва было адназначным: "Канешне, Арлоў — ён жа ў нас спецыяліст па музычных фільмах".

Так пазнаёміўся з Генадзем Іванавічам Цітовічам.

Пахвалюся: больш і даўжэй за мяне ніхто не здымаў ні самога майстра, ні народжаны ім славуты сённяшні Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча.

■■■

Вынікам пераможнага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939-га стала злучэнне Заходняй Беларусі з Усходняй. У рэспубліцы з'явіліся новыя вобласці: Баранавіцкая, Вілейская, Беластоцкая, Маладзечанская. Усюды з'явіліся савецкія ўстановы, у кінатэатрах пайшлі савецкія фільмы, па радыё замест спрэс польскіх "пёсэнэк" загучалі беларускія. Але паўтараліся адны і тыя, нешматлікія, бо іхні пералік быў, так бы мовіць, невялікі.

Цітовіч, што да таго скончыў у Вільні духоўную семінарыю, універсітэт і кансерваторыю, узначаліў музычную рэдакцыю Баранавіцкага радыё.

І вось неяк да яго прыйшлі дзве дзяўчыны, сёстры Вольга і Вера Федчыкі. Саромеючыся, папрасілі дазволу праспяваць, але тое, каб іх спеў запісалі і перадалі па радыё, дык пры Польшчы, сказалі, такое было абсалютна немагчыма. Песні гучалі незнаёмыя, мясцовыя, сугалоссе сястрыц злівалася, заварожвала. Ён прасіў сястрычак спяваць яшчэ і яшчэ. Спеву канца не было.

— Адкуль вы, дзяўчаткі? З якой вёскі, даражэнькія?

— Непадалёк: з-пад Ляхавічаў, з вёскі Вялікае Падлессе.

— І шмат вас там такіх пявух?

— Уся вёска спявае.

"Пявухі" — так і пайшло з языка Цітовіча.

Кадр фільма "Як пайду я дарогай..."

Да таго часу ён ужо назбіраў па вёсках Беларусі і занатаваў сотні песень. Ці варта гадаць, што неўзабаве гэты цікаўны непаседа быў ужо ў той вёсцы. Сапраўды, яна ўся аказалася пявучай! Што адразу здзівіла — спявалі радзінамі: дзеці, скажам, запявалі высокімі галасамі, бацькі падхоплівалі нізкімі, бабулі вялі падгалоскі. Там аказаўся і свой гарманіст. Канцэрт для Цітовіча, адзінага слухача, доўжыўся не адну гадзіну. Самадзейныя артысты спявалі ў непаўторнай народнай манеры, ды яшчэ й танчылі з прыпеўкамі!

Згадзіцеся, што такі завод-забой не змог бы пачацца "насуха". А тым больш скончыцца. Цітовіч амаль што літаральна пасяліўся ў Вялікім Падлессі, рэпетыцыі прызначаліся штовечар.

— Мала таго, што спявалі дзяўчаты ды жанчыны, — з захапленнем узгадваў ён у застоллі шмат гадоў пазней, — дык мужыкі былі не так сабе, для запаху, ведаеце, а — басы, барытоны! А якія непаўторныя падгалоскі!

Радзіна Цітовічаў амаль параднілася з пяючымі палешукамі. Дачка Святлана — свецкая прыгажуня, выдатная балерына — узгадвала:

— Хто не прыязджаў у Мінск з Вялікага Падлесся, атабарваліся ў нашай кватэры і жылі колькі ім патрэбна, як родныя.

Прыязджалі ж да гасціннага гаспадара, вядома, не без шчодрых вясковых дароў у напакаваных клунках.

З часам яму ўжо не трэба было хадзіць па хатах той вёскі, шукаючы "пявух" і "певуноў": людзі самі, скончыўшы справы на раллях, падаіўшы кароў, памыўшыся і пераапрануўшыся, ішлі на спеўку, бы на свята, да ўладальнікаў вялікіх хат. Сялян захапіла сама ідэя стварэння вялікага хору, жаданне "даць голас".

Першыя канцэрты праходзілі ў навакольных вёсках. Дабіраліся туды пешачкі: уласных коней ужо забраў, "абагульніў" калгас. Ішлі ў слату і непагадзь, беражліва хаваючы сцэнічнае адзенне, ішлі, каб данесці да беларусаў іх песні, каб хаця б гэтым узбудзіць нацыянальны гонар.

Салістка Валянціна Іванаўна Праневіч праз шмат гадоў, ужо ў XXI стагоддзі, узгадвала:

— Хадзілі спяваць нават у Баранавічы, за дваццаць кіламетраў! Са сваімі клуначкамі ішлі праз завіруху з песнямі. Цітовіч з намі, увесь час жартаваў, падбадзёрваў. Пасля канцэрта, вядома ж, "астывалі" ад поспеху, апладысментаў, сілкаваліся прыхопленым, і тая ж марозная дарога ў адваротны бок, бо заўтра — чакае ў хаце праца.

■■■

Зорным Алімпам было выступленне Падлесскага хору з канцэртамі ў Маскве падчас правядзення дэкады мастацтва БССР у чэрвені 1940-га. Больш за тое, Цітовічавы палешукі выступалі ў заключным канцэрце! Спрацаваў і палітычны фактар: усяго некалькі месяцаў таму самадзейныя артысты яшчэ гнуліся пад панамі, жылі пры капіталізме, а ўжо пяюць новыя, савецкія песні! Таварыш Сталін апладзіраваў ім стоячы. Паднялася, ляскаючы ў далоні, і зала. Было незразумела, каму авацыі: любімаму правадыру ці хору. Беларусы прынялі апладысменты на свой рахунак і паўтарылі забойную кадрылю.

Вяртаючыся пераможцамі, святкавалі ў цягніку. А роўна праз год і адзін тыдзень пасля заканчэння дэкады на Краіну Саветаў напалі фашысты. Пад акупацыю падпала ўся Беларусь, а першай — яе заходняя частка, у тым ліку Баранавіцкая вобласць з вёскай Вялікае Падлессе.

Хор гэты, як у мадэлі, паўтарыў лёс усіх беларусаў, што апынуліся пад акупацыяй: гарманіста забралі немцы за тое, што адмовіўся граць ім — і болей яго ў вёсцы не бачылі; семярых расстралялі паліцаі за песні пра Сталіна; некага пагналі ў Нямеччыну; траіх пасля вайны рэпрэсавалі органы, бо спявалі на вечарынах у гады акупацыі; найбольш галасістых пасля вайны забраў Цітовіч у Мінск — яны сталі ядром Дзяржаўнага народнага хора БССР. Астатнім засталося ціха дажываць у вёсцы Вялікае Падлессе, дзе няма ні леса, ні ракі, і ўзгадваць выступленне 15 чэрвеня 1940-га года ў Маскве, у Вялікім тэатры, дзе сваю кадрылю яны станцавалі перад таварышам Сталіным.

У апошні раз збяруцца старыя харысты ўвосень 1980-га на прыезд Цітовіча для здымак у маім фільме "Тры тысячы песень".

■■■

...Рушылі на Гомельшчыну, да стараверaў: Там, сказаў Цітовіч, збіраць песні яму яшчэ не даводзілася. Раніцай, не паспеўшы ад'ехаць ад Мінска і 30 кіламетраў, недзе ля Дукоры, Генадзь Іванавіч сваёй адметнай таропкай гаворкай папрасіў збочыць да прыдарожнай крамы. Купіў некалькі бутэлек таннага партвейна, "парцейнага", як абазваў гэтае пітво, дадаўшы: "Адзіны сродак, каб людзі пачалі спяваць. Прычым праверaны сродак, надзейны".

І сапраўды: не паспеў ён у Ветцы з адной "прыпеўшчыцай" раскаркаваць бутэлечку, як у хату зайшлі яшчэ некалькі пявуней. Пакаштаваўшы віна, яны ўжо не заўважалі ні кінакамеры, ні пякучага асвятлення, а здымачная група папросту стала для іх слухачамі. Генадзь Іванавіч жа ўспрымаўся імі не толькі як славуты артыст, але і як галантны мужчына. Ён іх проста зачараваў, і да ягонага "парцейнага" кожная з іх дадала, мо, па столькі ж ды плюс частаванне. Цітовіч узрушыў, раздорыў кабетак; яны спявалі, перабіваючы, перапяваючы адна адну, нават спрабавалі ў цеснай хаціне, збіваючы кінапражэктары, пусціцца ў скокі. Цітовіч падпяваў, уважліва слухаў і нешта запісваў у маленечкі нататнік.

Праз наступныя пару дзён па тым жа, папярэдне адпрацаваным "парцейным сцэнарыі", папрасіў ён разыграць яму "Гуканне вясны" ў заможнай вёсцы Барталамееўка.

Далей была Уздзеншчына, сумесны спеў Генадзя Іванавіча з самадзейным песнятворцам, амаль сляпым Паўлам Шыдлоўскім. Абодва яны пасля гаспадарскай наліўкі нечакана плёснулі недапіткі на столь — мяне здзівіла, але ім тое было, відаць, звычна. Я міжволі зірнуў ў гару: плямы, размывы, падцёкі па ўсёй столі, спрэс!

— Гэта дзённік гаспадара, — тлумачыў, смеючыся, Цітовіч. — Вось гэты след, — калі я быў тут яшчэ з хорам, кожны з харыстаў пакіснуў.

Уступіў гаспадар:

— Во тут, у куце столі, шырмаўская капэла адзначылася — кожны спявак. А на столі каля вакна Пятра Міронавіча Машэрава след, а там, ля дзвярэй, — пісьменнікі, паэты, касманаўт...

Генадзь Іванавіч узгадваў, як у 30-я гады запісаў недзе ў гэтых мясцінах Усходняй Беларусі (мяжа з Польшчай тады праходзіла праз Уздзеншчыну) песню "Мы брыгадай маладою", а пасля 1939-га, пасля ўз'яднання, дазнаўся, што аўтар яе — Павел Шыдлоўскі, які жыў тады пад панамі. Песня праз межавы дрот заляцела з Заходняй ва Усходнюю Беларусь.

— Няма для песні межаў! — весела закончыў Генадзь Іванавіч.

ТЭКСТ

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр

Працяг аповеду пра знакамітага беларуса — **у наступных нумарах "К".**

"Фармаліст, але малайчына!.."

Гэтыя словы, адрасаваныя яшчэ ў 1943 годзе герою майго сённяшняга нарыса — Андрэю Бембелю, належаць знакамітаму савецкаму скульптару Мацвею Манізеру, які стварыў помнік Уладзіміру Леніну, што стаіць перад Домам урада ў Мінску.

Барыс КРЭПАК

Андрэй Бембель у маскоўскай майстэрні на Сходні. 1943 г.

Набліжаецца 110-я гадавіна з дня нараджэння Бембеля — 17 кастрычніка (па новым стылі — 30-га). У наступным, 2016 годзе, споўніцца 30 гадоў з таго дня, як адышоў з жыцця гэты славуты майстар, выдатны педагог, грамадскі дзеяч і незвычайны па сваёй харызме чалавек.

Час ідзе, і тут нічога не зробіш. Але ў гісторыі беларускай культуры ёсць асобы, якіх забыць нельга. Такім чалавекам быў Андрэй Бембель, пра якога ў артыкуле і пойдзе гаворка. Яго імя добра вядома не толькі ў нашай краіне. І гэтая вядомасць звязана, галоўным чынам, з яго працай над такімі творамі, як манументальныя рэльефы ў інтэр'еры Дома ўрада і на помніку-абеліску на плошчы Перамогі ў Мінску, партрэт Мікалая Гастэлы, мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць — герой" і, канешне ж, славуты манумент "Курган Славы" на 21-м кіламетры Маскоўскай шашы.

Але мала каму вядомы той няпросты жыццёвы шлях, напоўнены перамогамі і паражэннямі, поспехамі і расчараваннямі, па якім прыйшлося прайсці скульптару, каб дасягнуць гэтых і іншых вяршынь. І незадоўга да смерці ён вельмі шкадаваў, што не ўдалося ажыццявіць свае даўнія мары: стварыць помнік Канстанціну Заслонаву, мемарыял героям Сталінграда, паставіць у Навагрудку помнік Адаму Міцкевічу і помнік-бюст Аляксандру Блоку ў вёсцы Лапаціна на Піншчыне, дзе паэт, ён жа "табельшчык 13-й інжынерна-будаўнічай дружыны", правёў амаль 200 дзён — са жніўня 1915 па сакавік 1917 года, будучы на Заходнім фронце Першай сусветнай вайны. І яшчэ, помню, вельмі шкадаваў мастак, што ў кастрычніку 1980 года не пабываў там на адкрыцці музея А.Блока — першага літаратурнага музея паэта ў СССР. Ды што казаць — многія задумы Андрэя Ануфрыевіча засталіся нерэалізаванымі. Урэшце, гэта лёс кожнага выдатнага майстра…



Андрэй Бембель. Партрэт Янкі Купалы. 1978 г.

Андрэй Бембель. Адзін з рэльефных фрызаў у Доме ўрада БССР. 1933 — 1934 гг.

Андрэй Бембель і яго лінія жыцця

Нязменная, непазбыўная думка аб творчасці не пакідала скульптара нават у перыяд яго цяжкай хваробы. Да самай смерці ён думаў, разважаў, гаварыў пра мастацтва, якое было для яго надзеяй, сумленнем, існаваннем. І я таму сведка, бо сустракаўся з маэстра вельмі часта на працягу апошніх дваццаці гадоў яго неспакойнага, бурнага жыцця і нават працаваў побач з ім, калі ён у першай палове 1980-х узначальваў Саюз мастакоў БССР. Так, я ўспамінаю тыя часы, калі мы былі побач — і ў творчасці (я пісаў пра яго ў СМІ шмат разоў і быў аўтарам сцэнарыя для тэлефільма пра скульптара), і ў сямейнай прасторы, і проста ў нашых сяброўскіх адносінах, нягледзячы на вялікую паміж намі розніцу ва ўзросце — 35 гадоў.

Прыгадваю першую сустрэчу з Бембелем восенню 1965-га, калі я, выпускнік Ленінградскага ўніверсітэта, пачаў працаваць у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Мяне пазнаёміла з ім Алена Васільеўна Аладава. Упершыню пабачыўшы яго, я вельмі разгубіўся. Бембель быў ледзь не адзіным выдатным беларускім мастаком, якога я ведаў яшчэ ў Піцеры па рэпрадукцыях яго знакамітага партрэта Мікалая Гастелы.

А трошкі пазней мы пасябравалі. Андрэй Ануфрыевіч быў чалавекам няпростым, супярэчлівым, меў складаны, часам узрыўны характар, і кантактаваць з ім было не заўсёды "ўтульна". У параўнанні з ім мае ўзаемаадносіны з яго калегамі — Аляксеем Глебавым, Сяргеем Селіханавым ці Заірам Азгурам — былі больш роўнымі. І многія здзіўляліся, як гэта мне ўдавалася знаходзіць з "некіраваным" Бембелем агульную тэму для добрых сяброўскіх гаворак і няпростых дыскусій.

Словам, Андрэя Ануфрыевіча як чалавека я паспеў нейкім чынам "вывучыць" знутры. Да таго ж, я добра ведаў і другую (апошнюю) жонку Бембеля — Марыю Вікенцеўну Мякінікаву, прафесара, доктара медыцынскіх навук, выдатнага спецыяліста па склеромнай праблеме; і быў знаёмы з яго дзяцьмі ад першай жонкі Вольгі Анатольеўны Дзядок — Кларай і Алегам, вядомым філосафам, паэтам, публіцыстам, які ўрэшце рэшт стаў святаром. А зараз я сябрую і з унучкай Андрэя Ануфрыевіча — арт-крытыкам Таццянай Алегаўнай Бембель.

Андрэй Ануфрыевіч быў натурай складанай і вельмі неадназначнай. Ён часам мог быць несправядлівым да сваіх калег, іншы раз шумна і надоўга разыходзіўся з кімсьці ў поглядах на што-небудзь, звязанае з творчасцю, альбо на педагагічнай і грамадскай глебе. Прызнаваць свае памылкі Бембель не вельмі любіў.

Іншы раз мне даводзілася, праўда, не заўсёды паспяхова, быць "трацейскім суддзёй" у вырашэнні такіх канфліктаў, як гэта было, напрыклад, з Анатолем Анікейчыкам, у адносінах да якога Бембель у апошнія гады быў не зусім справядлівы. Разам з Леанідам Шчамялёвым, якога Бембель паважаў, мы неяк памірылі абодвух, але, як аказалася, не да канца. На пахаванне свайго настаўніка Анікейчык так і не прыйшоў. Мо проста не змог — па нейкіх аб'ектыўных прычынах… Зараз дакладна сказаць не магу…

Мяркую, што ўпершыню "чорная кошка" прабегла паміж імі, калі з двух конкурсных партрэтных бюстаў Янкі Купалы, створаных Бембелем і Анікейчыкам для ўстаноўкі ў 1973 годзе дароўнага помніка ў Араў-парку пад Нью-Ёркам, эксперты аддалі перавагу апошняму, гэта значыць вучню Бембеля. Такое, канешне, самалюбіваму маэстра перажыць было цяжка, хаця, уласна кажучы, Анікейчык тут быў зусім ні пры чым…

Даводзілася ўладжваць нейкія канфлікты Бембеля і з іншымі яго калегамі па мастацтве. Напрыклад, з яго яшчэ адным вучнем — Анатолем Арцімовічам, сааўтарам "Кургана Славы", якога "забылі" ўключыць у спіс прэтэндэнтаў на Дзяржаўную прэмію БССР, а Андрэй Ануфрыевіч, так бы мовіць, прамаўчаў. Канфліктаваў Бембель (я таму сведка) нават з галоўным мастацкім кіраўніком праекта мемарыяла "Брэсцкая крэпасць — герой", народным мастаком СССР Аляксандрам Кібальнікавым з прычыны якасці створаных ім у сааўтарстве з Уладзімірам Бабылём тэматычных рэльефаў у скульптурнай кампазіцыі "Мужнасць" (галава Воіна).

> Карацей кажучы, з "гнязда Бембелева" выйшлі амаль усе скульптары 1960 — 1980-х гадоў. Хтосьці з іх часам атрымліваў ежу і часовы прытулак у прасторным доме Бембеля на вуліцы Беламорскай, а таксама прысутнічаў на хатніх святах у гонар дня нараджэння маэстра… І наогул, Бембель быў **чалавекам, далёкім ад паказнога арыстакратызму і піжонства**. Вельмі мала звяртаў увагі на быт…

З іншага боку, Бембель рознымі спосабамі вельмі шчыра дапамагаў сваім некаторым студэнтам, часам засцерагаючы іх ад памылак у творчых і бытавых дзеяннях. Асабліва шанаваў "некіруемага", але таленавітага мастака і спартсмена Канстанціна Сароку (з яго бацькам, таксама скульптарам, — цяпер зусім забытым, Бембель пасябраваў адразу пасля вайны); прадказаў вялікую будучыню Льву Гумілеўскаму і Анатолю Анікейчыку, паважаў мастакоўскі дар Івана Міско, Уладзіміра Слабодчыкава, Леаніда Давідзенкі, Генадзя Буралкіна, Галіны Гаравой, Уладзіміра Панцялеева, Аляксандра Каструкова, Уладзіміра Жбанава, Аляксандра Фінскага, Юрыя Палякова…

Карацей кажучы, з "гнязда Бембелева" выйшлі амаль усе скульптары 1960 — 1980-х гадоў. Хтосьці з іх часам атрымліваў ежу і часовы прытулак у прасторным доме Бембеля на вуліцы Беламорскай, а таксама прысутнічаў на хатніх святах у гонар дня нараджэння маэстра. У мяне захавалася фатаграфія: у доме Андрэя Ануфрыевіча мы святкуем яго 70-гадовы юбілей. За багатым сталом побач са мной — Клара Бембель, Віктар Грамыка, Віктар Вярсоцкі, Канстанцін Сарока з гітарай, Павел Цомпель, Аляксандр Веліксонаў, Генадзь Мурамцаў, Раіса Часнова і іншыя, хто не трапіў у кадр. А здымаў нашу цёплую кампанію архітэктар Юрый Казакоў, адзін з сааўтараў Бембеля па Брэсцкім мемарыяле.

І наогул, Бембель быў чалавекам, далёкім ад паказнога арыстакратызму і піжонства. Вельмі мала звяртаў увагі на быт... Я бачыў яго і ў хатняй піжаме, і на кухні з пяльмешкамі, і са шклянкай каньяку ў адной руце і цыгарэтай — у другой, і аднойчы — з нейкай маскоўскай камандай на стадыёне ў час футбольнага матча мінскага "Дынама" (з Э.Малафеевым). Дома ў яго была звычайная мэбля, халадзільнік, тэлевізар і — вельмі многа кніг, часопісаў, газет і прадметаў мастацтва. На гэта ён грошай не шкадаваў!

Затое, бываючы "на людзях" — у Тэатральна-мастацкім інстытуце, Саюзе мастакоў, на розных канферэнцыях, з'ездах, партыйных і творчых пленумах, на вернісажах выставак і гэтак далей, — ён заўсёды быў акуратна і з густам апрануты, хадзіў звычайна ў беласнежнай сарочцы, цёмным касцюме і пры цудоўным гальштуку. А ў кішэньцы пінжака заўжды ляжала белая насоўка. Дэндзі, дый годзе!

А вось што казала пра яго Вольга Дзядок — жанчына, якая ведала пра свайго мужа быццам бы ўсё: "Андрэй — вялікі талент. Адданасць сваёй справе. Жыццё ў мастацтве — гэта вызначае ўсё. Выдатны мастак. Манументаліст. І ў жыцці, і ў творчасці. Ён разумее і любіць жыццё ў шырокім маштабе. Чалавецтва — яго маштаб. Альбо як мінімум — краіна. Але які складаны і супярэчлівы гэты чалавек! Рысы, якія ўзаемна выключаюць адна аднаму. Усё пераблытана ў гэтым чалавеку, не разабраць, які ён ёсць на самой справе. А сам ён і не спрабуе ў сабе разабрацца, лічыць проста, што ён самы лепшы. Якая страсць у ім не загаворыць — так, маўляў, і трэба…"

К

Працяг артыкула — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстаўка **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі, — да 2 лістапада.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"** .

Выстаўкі:

■ Выстаўка твораў заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Івана Сталярова**"Настаўнік і навучэнцы"** — да 10 жніўня.
■ Выстаўка **"Беларускі іканастас"** (творы іканапісу і драўлянай пластыкі кан. XVIII — пач. XIX стст. са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) — да 27 верасня.
■ Выстаўка **"Муж, мужчына, воін"** (іканапіс кан. XVIII — пач. XIX стст. са збору Веткаўскага музея старааабрадніцтва і беларускіх традыцый ім. Ф.Р. Шклярава) — да 27 верасня.
■ Персанальная выстаўка Ашота Хачатрана **"Вандроўка па арт-прасторы Ашота Хачатрана"** (Санкт-Пецярбург) — да 7 верасня.

Арт-кафэ:

■ Персанальная выстаўка Наталлі Марчанка **"Мой кветкавы каляндар"** — да 24 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:

■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Барока ў карнавой пластыцы"** — да 20 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:

■ Выстаўка **"Тры аповеды пра вайну"** да 70-годдзя Вялікай Перамогі (франтавыя малюнкі Васіля Маркава з калекцыі Генадзя Кавецкага; фатаграфіі (1941 — 1945 гг.) Аляксандра Дзітлава з фондаў музея; праект "Дзяўчыны Перамогі") — да 6 верасня.
■ Сумесная выстаўка Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга **"70-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца"** — да 6 верасня.
■ Выстаўка **"Ад крыналінаў і турнюраў да мадэрна. Гісторыя моды пачатку XX стагоддзя"** — да 6 верасня.
■ Выстаўка графікі Аляксея Навіцкага **"Вандраванне"** — да 15 жніўня.
■ Выставачны праект **"Вялікая прэзентацыя музейных рэліквій: 79 прыступак углыб гісторыі"** — да 31 снежня.
■ Арт-праект фотамастака Ірэны Гудзіеўскай і агенцтва мадэляў "Студыя Тамара" — **"Зачараванне"** — з 13 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Мемарыялізацыя Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім грамадстве: памяць учора і сёння"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстаўка:

■ Фотавыстаўка Ірэны Гаражанкінай **"Баравікі. Прыгажосць іх фамільная рыса"** — да 28 жніўня.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстаўка **"Свет вялікіх папугаяў і пеўчых птушак"** — да 28 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстаўка:

■ **"Беларускі кінематограф 20-х — 30-х гг. XX стагоддзя ў кінаплакаце"** — да 30 жніўня.

Кінапраграмы:

■ Рэтраспектыва **"Выкшталцоная Гарбо"** — да 31 жніўня.
■ Рэтраспектыва **"Памяці Амара Шарыфа"** — да 29 жніўня.
■ Рэтраспектыва **"Беларуская мультпанарама. 40 год на экране. Частка 18"** — да 31 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:

■ Выстаўка аднаго спектакля **"Балада пра белую вішню"** — да 1 верасня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстаўка:

■ Выстаўка **"Прыгожыя і знакамітыя (экалогія пачуццёвасці)"** (толькі для дарослых) — да 13 верасня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект Бабруйскай гарадской дзіцяча-юнацкай узорнай студыі выяўленчага мастацтва "Радуга" **"Спадчыннікі Вялікай Перамогі"** — да 10 жніўня.
■ Выстаўка, прысвечаная юбілею Паветрана-дыстантных войскаў Узброеных сіл СССР і сіл спецаперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, **"85 год на абароне Айчызны"** — да 23 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Марыя Дарота Радзівіл. Час культурнага адраджэння"** — да 20 верасня.
■ Выстаўка **"Fiat Lux!"** — да 10 жніўня.
■ Выстаўка **"Сляды гісторыі"** — да 16 жніўня.

Слуцкая брама

■ Выстаўка **"Археалагічная спадчына Нясвіжа"** — да 30 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"**.
■ Выстаўка **"Баявыя нагалоўі (шлемы) засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст. (Рэканструкцыя)"** — да 30 верасня.
■ Выстаўка ўзнагарод алімпійскага чэмпіёна Максіма Мірнага **"Мірныя трафеі"** — да 31 кастрычніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўка:

■ Выстаўка да 70-годдзя Вялікай Перамогі **"Дарогамі вайны"**.
■ Выстаўка да **100-годдзя** правядзення Міжнароднага кангрэса пісьменнікаў у абарону культуры.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўкі:

■ Аўтарскі фотапраект Валерыя Вядрэнкі **"Святло Вязынкі. Графіка"** — да 15 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:

■ Выстаўка Аліка Замосціна **"Пункт гледжання"** — да 30 жніўня.
■ Выстаўка твораў мастацкай разьбы па шкарлупіне яйка **"Па слядах Фабержэ"** майстра Аляксандра Рыжэўскага — да 28 жніўня.
■ Выстаўка жывапісу чэшскай мастачкі Івы Мразковай **"Нерэальны свет"** — да 30 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:

■ Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да 20 верасня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ "**Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Свет прыроды"** (выстаўкі "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выстаўкі:

■ Персанальная выстаўка Зоі Луцэвіч **"Водар кахання..."** — да 9 верасня.
■ Выстаўка **"Срэбра са збору Нясвіжскага музея-запаведніка"** (рэчы сталовай аздобы кан. XIX — пач. XX стст.) — да 23 жніўня.
■ Выстаўка **"Лукамор'е"** (чароўны свет казак Аляксандра Пушкіна ў вобразах персанажаў, якія рухаюцца) — да 6 верасня.
■ Выстаўка **"Зямлястаянне. Эмілія 2012. Культурная спадчына пасля землятрусу"** (аўтарскія фатаздымкі і мультымедыя распавядаюць пра вынікі землятрусу ў рэгіёне Эмілья-Раманья ў Італіі) — да 16 жніўня.
■ Выстаўка матылькоў з прыватнага збору М.Рамазанава **"Лунаючыя кветкі"** — да 13 верасня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:

■ **"Кнігі, якія ведаюць усё"** (энцыклапедычныя выданні XIX — XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 30 жніўня.
■ Мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў **"Край родны, назаўжды любімы"** з фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля — да 31 снежня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:

■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстаўка, прысвечаная 70-годдзю заканчэння Другой Сусветнай Вайны, **"На Тихом океане свой закончили поход..."**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Выстаўка **"Старонкі непа100ронняй вайны на Лідчыне"**.
■ Выстаўка **"Гукі цывілізацыі, якая заснула"**.
■ Выстаўка **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстаўка **"З мастацкім словам па жыцці"**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстаўка з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Юбілейная выстаўка Аляксандра Сільвановіча **"Неба"** — да 18 жніўня.
■ Юбілейная выстаўка Аляксея Пшанко **"Святло. Прастора. Час"** — да 18 жніўня.

УВАГА! / ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752